© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 93 (2453)
25 лістапада 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 нап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СЁННЯ Ў МАСКВЕ ПАЧЫНАЕ РАБОТУ III УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД КАЛГАСНІКАЎ



Ёсць у Клецкім раёне калгас «Памяць Леніна». Звыш трыццаці цэнтнераў збожжа, двухсот — бульбы з гектара атрымалі сёлета земляробы. Важкі стаў працадзень. Перабудоўваюцца калгасныя вёскі.

Больш за восем гадоў узначальвае гэтую гаспадарку Іосіф Іосіфавіч Плаўскі. Увесь гэты час ён у пошуках, поўны нябурымслівасці добразычлівасці да людзей і разам з тым — прынцыповасці. Не так даўно Іосіф Іосіфавіч узнагароджаны ордэнам Леніна. Клецкія хлебаробы выбралі яго дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. А цяпер Плаўскі ў Маскве — ён дэлегат III Усесаюзнага з'езда калгаснікаў.

Фота Л. ЯЎДЗІНА.

Манар ПАСЛЯДОВІЧ

ВОСЬ ЯНЫ, НАШЫ ГЕРОІ!

Сёння ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве адкрываецца III Усесаюзны з'езд калгаснікаў, які абмяркуе і зацвердзіць новы Прыкладны Статут сельгасарцелі. Да гэтага праект Статута, як вядома, шырока абмяркоўваўся на калгасных і раённых сходах хлебаробаў, на абласных канферэнцыях, на рэспубліканскіх з'ездах калгаснікаў.

Мне пашанцавала пабыць на III з'ездзе калгаснікаў Беларусі, паслухаць даклад старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва, прамову кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэрава, пачуць думкі дэлегатаў з розных куткоў нашай рэспублікі.

У свой час, яшчэ зялёным юнаком, я сустракаўся з першымі камунарамі, бегаў, як апантаны, у кампаніі сваіх равеснікаў за незвычайным дзівам, якое цягнула за сабою двухрамешны плуг. Гэтае заморскае дзіва называлася трактарам. Пазней мне самому даводзілася прымаць удзел у арганізацыі калгасаў, пісаць у газетах пра іх першыя крокі. А чаго толькі не плявузгалі пра наш сацыялістычны лад на вёсцы ворагі! І пра супольную для ўсіх жанчын і мужчын пасцель, і пра голад, да якога давядзе нечуваная нідзе на свеце форма гаспадарання. Гэтая новая форма нібыта пярэчыць усёй псіхалогіі хлебароба, задушыць ініцыятыву вольнага гаспадара, звядзе на нішто спрадвечную любоў селяніна да зямлі.

Дзе сёння гэтыя няпрошаныя дарадцы, балельшчыкі і плакальшчыкі, якія пралівалі кракадзілавы слёзы, калі наша партыя пачала ажыццяўляць на ўсёй краіне вялікі ленінскі кааператыўны план? Гэты план, увасоблены ў буйных, узброеных перадавой савецкай тэхнікай калектыўных гаспадарках, вытрымаў самыя найцяжэйшыя выпрабаванні апошняй вайны і цяпер служыць узорам для многіх краін, якія сталі і становяцца на сацыялістычны шлях развіцця!

Сёння ў нашых калгасах збіраюць такія ўраджаі, якія і не сніліся селяніну-аднаасобніку. Як паведаміў у дакладзе Ц. Я. Кісялёў, значная колькасць калгасаў сабрала ўраджай звыш 25 цэнтнераў з гектара, а многія — па 30 і больш цэнтнераў. Валавая вытворчасць збожжа па рэспубліцы перавысіла 4 мільёны 100 тысяч тон, або на адзін мільён 200 тысяч тон больш, чым у мінулым годзе, у тым ліку калгасы сабралі 2 мільёны 900 тысяч тон, або на 900 тысяч тон больш, чым летась.

Не менш цікавыя лічбы і па продажы дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі. Калі ў 1940 годзе ў рэспубліцы было закуплена 283 тысячы тон збожжа, дык у гэтым годзе — 480 тысяч тон, бульбы больш чым у два разы, малака — больш чым у чатырнаццаць разоў і г. д.

Слухаеш гэтыя лічбы і ўспамінаеш, што зусім нядаўна, здаецца, толькі ўчора, ты бачыў, як у калгасе «Чырвоны бор» Пухавіцкага раёна жанчыны і падлеткі вымушаны былі ўскопваць поле рыдлёўкамі, бо ўсё цяглo, увесь калгасны набытак былі знішчаны гітлераўцамі, здаецца, толькі ўчора людзі за многія кіламетры пераносілі на сваёй спіне насенне з чыгуначных станцый, бо не было на чым прывезці. Аднойчы я паспачуваў жанчынам у іх нялёгкай працы. Адна з іх спакойна адказала:

— Што цяжка, дык нам не прывыкаць. Самае важнае, што няма ўжо на нашай зямлі гэтых гітлераўскіх галаварэзаў. Скрозь свая Савецкая ўлада. Як падумаеш пра такое, на душы адразу спакайнее. Мы зноў сабе гаспадары. Сёння цяжка, заўтра будзе лягчэй.

Гэтая перакананасць, вера людзей у сваю родную ўладу, у ленінскую партыю рабіла цуды. Церпячы неймаверныя нястачы, чалавек працаваў да поўнай стомы, каб толькі хутчэй аднавіць сваю родную вёску, свой калгас.

Ленінскі кааператыўны план вывеў вёску з галечы, напоўніў палеткі гулам трактараў і камбайнаў, узняў над стрэхамі рагатыя антэны тэлевізараў, прынёс у кожную сям'ю хлеб і скварку. Дзякуючы ленінскаму кааператыўнаму плану, з кожным годам большае на вёсцы сучасных дамоў з усімі выгодамі, клубаў, дамоў культуры, бібліятэк.

З хваляваннем я слухаў на з'ездзе выступленні выдатнай даяркі Героя Сацыялістычнай Працы Лідзіі Асіюк, старшыні аднаго з лепшых калгасаў на Гродзеншчыне Пятра Іосіфавіча Дзеншчыкова і многіх іншых дэлегатаў. Яны гаварылі не толькі пра зробленае, але і пра тое, што трэба зрабіць, што новага ўнесці ў праект Прыкладнага Статута калгаса.

Мне думалася, як мала мы, літаратары, зрабілі, каб адлюстраваць у сваіх творах велізарныя змены, што адбыліся і адбываюцца ў нашай калгаснай вёсцы. Колькі было ў нашай літаратуры непатрэбшчыны, мышынай валтузні вакол «праблемы» станоўчага героя, як часам зацята спаталіся, калі, па-сутнасці, тэмы для спрэчкі не было, як выдавалі за эталон — здаралася і такое — творы, якія не мелі нічога агульнага з сапраўдным жыццём народа.

Я гляджу на ветэранаў, на энергічную моладзь — будучых герояў нашых кніг — і радуюся. Жыццё, вялікае і багатае, ідзе сваім праверaным шляхам. І ў гэтым жыцці мы будзем чэрпаць тэмы для твораў, што ўслаўляюць веліч і высакароднасць нашага сучасніка.

Антон БЯЛЕВІЧ

ДУМА ДЭЛЕГАТА

На з'езд калгасны дэлегатам я Абраны ў Мінску...

Дэлегат

Душу маю пашана кратае,
Такой пашане вельмі рад.

Палешукі — не чалавекамі —
Былі ў далёкі змрочны час.
Няўмекамі і недарэкамі
Абшарнікі лічылі нас.

Размёў нядолю палыновую
Кастрычнік бурай агнявой.
Жывём вялікай доляй новаю
І рэчаіснасцю жывой.

Пайду араць —жаўрук сардэчныя
Над полем песні мне пяе;
Пайду касіць лугі зарэчныя —
Трава і краскі ўсе мае.

Усё маё, маё навокала,
Мая брыгада, мой калгас...
Сябры! Ураджаямі высокімі
Год юбілейны цешыць нас.

Насыпаў, шчыры, збожжа нам,
Уладна хлеб лёг на стале...
Прыйшлі прафесіі к нам з горада,
Ёсць інжынеры і ў сяле.

Касіць! Гатоў! А трэба —
трактамі
Машыну гонкую вяду.
Араць! Гатоў! Плугамі трактара
Барозны роўныя кладу.

Не навіна даўно ў нас радыё
І электрычнае святло.
Яно нас радуе. І радугай
У побыт вёскі заплыло.

Жыццё святлом, як рэчка
поўніцца
У берагах сваіх вясной...
Краіна, зорная цудоўніца,
Стаю на вахце я тваёй.

Адна ты гэтакая слаўная,
Табе паклоны я кладу.
Іду тваёй хадой дзяржаўнаю,
Дарогай Леніна Іду.

БЕЛАРУСКІ БАЛЕТ НА ФІЛІПІНАХ

Сёння з Масквы ў сталіцу Філіпінскіх астравоў — Манілу прамым авіярэйсам вылецела група выпускнікоў і навучэнцаў Мінскага харэаграфічнага вучылішча на чале з мастацкім кіраўніком А. Калядзянкам і канцэртмайстрам М. Тархавай.

У склад групы ўваходзяць выхаванцы вучылішча, цяпер артысты Беларускага акадэмічнага вялікага тэатра оперы і балета М. Самалазаў, Л. Цярэнцьева, С. Свірыдава, Л. Калечыц, артыстка балета Белдзяржфілармоніі Л. Лагуціна, саліст танцавальнай групы Дзяржаўнага народнага хору БССР В. Чысцюнін, а таксама вучні-старшакласнікі вучылішча У. Іваноў, А. Казінец, В. Захараў, В. Бескаравайны, В. Болбат і Н. Сухоцкая.

Госці з Беларусі наведаюць гэтую далёкую краіну па запрашэнні Манільскага студэнцкага камітэта. Яны паназіраюцца са старажытным танцавальным мастацтвам жыхароў сямі тысяч астравоў, пабываюць ва універсітэце, навучальных установах, тэатрах, выступяць з канцэртамі перад студэнцкай моладдзю і прадстаўнікамі тэатральна-музычнай грамадскасці.

У далёкую паездку прадстаўнікі нашай рэспублікі павезлі вялікую і разнастайную канцэртную праграму, складзеную з нумароў народнай танцавальнай творчасці і класічнага рэпертуару. Філіпінцы ўбачаць беларускія танцы «Крыжачок», «Кола», харэаграфічную сцэнку «Сапернікі», «Рускую пляску», «Украінскі гапак», «Малдаўскі танец».

З класічных нумароў будуць выкананы адажыо і танцы з балетаў Чайкоўскага «Шчаўкунчык» і «Спячая прыгажуня», падэ-дэ з балета Адана «Карсар», «Вальс» Шапэна, «Аве Марыя» Баха, «Паляўнічы і птушка» Грыга, адажыо з балета Лядава «Казка аб мёртвай царэўне» — усяго больш за 20 нумароў.

Маладыя артысты беларускага балета прабудуць на Філіпінах да сярэдзіны снежня.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ СТУДЭНТАЎ

У Мінску 20 лістапада адбыўся заключны канцэрт інтэрнацыянальнага фестывалю замежных студэнтаў, якія навучаюцца тут. Ён прысвячаўся стагоддзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Амаль ва ўсіх жанрах дэманстравалі сваё мастацтва в'етнамскія навучэнцы. З вялікім поспехам выступіў хор в'етнамскіх юнакоў і дзяўчат, якія займаюцца ў гарадскім прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы № 53. Ён выканаў на рускай мове песню аб Леніне С. Тулікава і на роднай мове — песню «Наперад да перамогі» на словы прававодыра свайго народа Хо Шы Міна. Танцавальны калектыў гатага ж вучылішча выдатна выканаў танец з бамбукамі і беларускую «Лявоніху». Нгуен Донг Хо і Нгуен Нгок прачыталі ўрывкі з паэмы У. Маякоўскага «У. І. Ленін».

Добра прынята было выступленне ўдзельнікаў эстраднага ансамбля «Афрыканас» з Беларускага політэхнічнага інстытута, у якім аб'ядналіся прадстаўнікі Ганы, Нігеры і Малі. Яны падрыхтавалі да фестывалю сваю ўласную песню аб У. І. Леніне. Гледачы цёпла прымалі выступленні аспіранта БДУ з Ганы Джона Флетчэра, студэнтаў БПІ — балгарына Ангела Ангелава, непальца Джа Ратнеша, студэнта БДУ ліванца Антуана Жака Амедзі, інданезійска-венгерскі эстрадны ансамбль «Індавенгр» (БПІ), іншых калектываў і салістаў.

Граматамі, устаноўленымі для ўзнагароджання пераможцаў фестывалю, адзначаны хор і танцавальны калектыў ГПТВ № 53, вакальная група БПІ, танцавальны калектыў БДУ, эстрадны ансамбль «Афрыканас» і «Індавенгр», рад салістаў. Зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў у Мінску ўзнагароджана Граматай гаркома камсамола за актыўны ўдзел у мастацкай самадзейнасці.

Рад калектываў і салістаў-пераможцаў фестывалю рэкамендаваны журы для паездкі ў Маскву на заключны этап агляду мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў СССР.

БЕЛТА.

ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНСКІХ ІДЭЙ

З ПЛЕНУМА ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

З пачуццём высокай адказнасці рыхтуюцца да ленінскага юбілею беларускія літаратары. Паэты і празаікі, драматургі і публіцысты натхнёна працуюць над творамі, у якіх імкнуцца глыбока і ярка раскрыць неўміручы вобраз Ільіча, яго жыццё і рэвалюцыйную дзейнасць, багацце яго тэарэтычнай спадчыны, барацьбу партыі і народа за перамогу ленінскіх, камуністычных ідэалаў.

Аб тым, што зроблена беларускімі літаратарамі ў гэтым кірунку і што трэба яшчэ зрабіць, каб дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння правадыра, ішла гаворка на чарговым пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, які адбыўся, як мы паведамлялі ўжо, 19 лістапада.

З дакладам «Беларуская літаратура да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» выступіў на пленуме сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Мележ. Даклад, у якім быў акрэслены пяцідзесяцігадовы шлях, пройдзены беларускай савецкай літаратурай, падсумаваны і прааналізаваны вынікі плённай работы пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі па дастойнай сустрэчы ленінскага юбілею, даклад, у якім знайшла яркае адлюстраванне думка аб тым, што ўсе гады развіцця беларускай савецкай літаратуры прайшлі пад вечна жывым уплывам ідэй Леніна, пад сцягам ленінізма, што наша літаратура чэрпае сілы з крыніцы таго жыцця, якое фарміруюць, поўняць жывой энергіяй ідэі Ільіча, з'явіўся добрай асновай для той шырокай, прынцыповай і карыснай гутаркі, якая адбылася на пленуме.

Пісьменнікі, якія прынялі ўдзел у абмеркаванні даклада, перш-наперш падкрэслівалі, што зараз, у перыяд абвастрэння ідэалагічнай барацьбы, дзеячы літаратуры і мастацтва павінны асабліва высока трымаць сцяг партыйнасці, народнасці, ідэйнасці савецкага мастацтва, трымаць у чысціні нашу магутную ідэйную зброю — марксісцка-ленінскую ідэалогію, аддаваць усе сілы і здольнасці палітычнаму, маральнаму, эстэтычнаму выхаванню будаўнікоў камунізма.

— Першыя ў маім літаратурным жыцці вершаваныя радкі,—сказаў у сваім выступленні Максім Лужанін,—звязаны з імем Уладзіміра Ільіча Леніна.

Можа быць, мала, можа быць, недасканала, — працягнае прамоўца, — давялося напісаць пра Леніна, але гэты вобраз, думаю, як і для большасці з нас, заўсёды рупіць, яшчэ не выпісваецца так, як хочаш. Цяпер ужо трэба гаварыць і думаць аб Леніне інакш. Перад намі ёсць ленінская тэма, ёсць вопыт ленінскага жыцця і ўсё тое, што Ленін прадбачыў, што адбываецца на нашых вачах. На падставе гэтага мы ўжо можам адкрываць новыя і новыя рысы ў гэтым вобразе, не проста нанізваць словы, пачуцці вакол дарагога імя, а іменна адкрываць. Гэта не лёгка, але інакш — нельга. Хочацца, каб з твораў ён выглядаў такім, якім быў у жыцці: чулым і бязлітасным, нястомным і хворым, заслуханым у музыку і гатовы да вострага адказу ў спрэчках, і пры ўсім гэтым — звычайным чалавекам, без усялякага намёку на вянец, на німб вакол галавы.

— Я схільны, — гаворыць далей М. Лужанін, — падтрымаць думку дакладчыка пра тое, што беларуская літаратура на працягу апошніх пяцідзесяці гадоў ішла ўперад, падзвігу. Успомніце, як гаварыў Чапаеў: «Я ж усяго два гады як грамаце ўмею». Тое ж самае можна сказаць і пра нашу літаратуру, а між тым подзвіг яе сапраўды легендарны. За гэты пяцьдзесят гадоў прыйшлі ў літаратуру Чорны, Куляшоў, Танк, Шамякін, Макаёнак, Барадулін. У гістарычным працэсе гэты адрэзак часу меншы, чым чапаеўскія два гады. А ці трэба даводзіць, што толькі з прыведзеных прозвішчаў ужо складаецца літаратура. А можна ж выстраіць яшчэ не адзін рад прозвішчаў, і не менш слаўных. Я ведаю, што аргументацыя прозвішчамі не лепшы сродак аналізу. Леніп гаварыць аб тым, што робяць гэтыя прозвішчы. Тады пералік імёнаў стане больш гнуткім.

Адзначыўшы змястоўнасць і цікавасць даклада, прамоўца ўсё ж заўважае, што, на яго думку, дакладчыку варта было б адхіліцца яшчэ на адзін крок назад, звязаць практыку папярэднікаў з практыкай Ф. Багушэвіча, з практыкай нашай народнай творчасці.

— Усім вядома любоў Ільіча да народнай творчасці, да народнага слова, — гаворыць М. Лужанін. — Фальклор — нацыянальная і сацыяльная глеба, якая ўзняла нашых папярэднікаў і зрабіла іх галаснікамі народа.

Усім вядомы ленінскі клопат аб мове, аб яе багацці і чысціні, гаворыць далей М. Лужанін. На жаль, у некаторых нашых творах мова вельмі бедная, сухая. Абыякавасць да мовы, нежаданне распрацоўваць яе скарбы — адзнака шэрых твораў. Значыць, падкрэслівае прамоўца, не турбуюць галаву такога пісьменніка цікавыя думкі, няма чаго яму выказаць, аб чым гаварыць. Горка, зазначае з сумным жартам М. Лужанін, ад моўнай неахайнасці, горка і ад драбнаты думак, асабліва ў вершах, якія часта не нясуць ніякага зараду.

Спыняецца прамоўца на праблеме героя ў літаратуры. Ён зазначае, што чытач засумаваў па героі, хоць і ёсць нямала твораў, якія заслужылі законную павагу і пашану, што нашай літаратуры трэба яшчэ доўга працаваць, каб у ёй з'явіліся героі такой яркай тыпізацыі, як Сымон-музыка ці Адольф Быкоўскі, якія, на думку прамоўцы, ужо не проста героі, а людзі, уключаныя ў кола нашага побыту, нашых адчуванняў, уяўленняў, сталі нашымі знаёмымі.

— Мне здаецца, — падкрэслівае М. Лужанін, — што чытацкі смутак па герої недарэмны. Чытач хоча, каб можна было паглядзець на героя, каб хацелася стаць побач з ім, пайсці далей за ім. На жаль, часта сам аўтар ідзе не наперадзе героя, ведучы яго, а памалу пляцецца поруч. Далёка не ўсе творы дазваляюць адчуць інтэлектуальную розніцу паміж героем і аўтарам. А пакуль будзе існаваць такая разбежка, не з'явяцца паўнакроўныя героі, не можам мы разлічваць на значныя здзяйсненні.

Сучаснае адным бокам злучаецца з мінулым, а другім—з будучым. Іншае сонца цяпер свеціць над Палессем. І старадаўняя сялянская справа—касьба хоць і дасюль дзе-нідзе робіцца дзедаўскім спосабам, але іншы спрыт і ўмельства ў цяперашніх людзей. Бо ўбачылі іхнія вочы іншае, ленінскае святло. Такія думкі, заўважае прамоўца, трэба трымаць пісьменніку на ўзбраенні.

— У размову аб герої,—гаворыць М. Лужанін у канцы сваёй прамовы,—дазвольце ўключыць Льва Мікалаевіча Талстога. Ён пісаў, што найбольш важны «не азот і кісларод, якія знаходзяцца ў глебе, не асаблівы плуг і гной, а тая галоўная прылада, праз якую дзейнічае і азот, і кісларод, і гной, і плуг, гэта значыць — работнік — мужык». Мне ўспомніліся гэтыя словы падчас нядаўняга з'езду калгаснікаў, не «прылад працы», як горка пісаў Талстой для свайго часу, а творцаў працы. Аб творцах працы мусіць зараз гаварыць літаратура, гаварыць на ўсю сваю мастацкую сілу. Трэба толькі старацца бачыць і разумець, што адбываецца ў свеце. Сучаснікі слушна заўважалі, што адчуваць і разумець думкі мас Леніну дапамагала не толькі яго геніяльнасць, а і скромны лад жыцця. Гэтаму не шкодзіць павучыцца, каб стварыць літаратуру пра творцаў працы. У нас ёсць для гэтага ўсе падставы. Мы з вамі багацейшыя за папярэднікаў на спадчыну Леніна, багацейшыя на яго розум, зрок, на прыклад яго жыцця, на яго нястомную працу.

Аб укладзе беларускіх пісьменнікаў у сусветную Ленініяну гаварыў на пленуме Уладзімір Юрэвіч. Гэты ўклад, зазначыў прамоўца, даволі багаты, калі мець на ўвазе не толькі тыя творы, што прысвечаны непасрэдна Леніну, але і тыя, дзе ёсць вобраз чалавека ленінскай эпохі, чый духоўны змест складае ленінізм—не як прыўнесеная звонку сума ведаў, а як асабістая глыбокая перакананасць.

— І таму мне здаецца,—заўважае прамоўца,—што далейшае развіццё беларускай Ленініяны магчыма толькі тады, калі мастакі будуць засяродквацца сваю ўвагу на раскрыцці ленінскай думкі, на адлюстраванні самога працэсу яе нараджэння, авалоданні ёю масамі, працэсу нараджэння яе ў масах. Лабавое ўспрыманне генеральнага тэзісу нашага жыцця і нашай творчасці—Ленін і народ—павінна будзе саступіць месца, як мне здаецца, «ускоснай тыпізацыі», паказу ўсеабдымнай, усепаглыбленай засяроджанасці Леніна і ленінцаў на праблемах надзённага жыцця грамадства. Уменне жыць думкамі Леніна і забяспечыць творчы поспех тым мастакам слова, якія будуць звяртацца да вобраза Леніна, да вобраза перадавога чалавека сучаснасці, хто здолее паказаць народнае ў Леніне і ленінскае ў народзе, занятым здзяйсненнем яго смелых ідэй пра камунізм,—той выканае адну з важнейшых і надзённых задач савецкай літаратуры. Як да найглыбейшай скарбніцы думак, як да невычэрпнай крыніцы шчырасці і сумлення далучаюцца зноў і зноў беларускія мастакі слова да самога зместу жыцця Леніна, каб у напружанню пошуку здабыць найпаўнейшыя і найглыбейшыя адказы на сучасныя праблемы народнага жыцця.

Прамоўца гаворыць далей аб тым, што, на яго думку, даўно наспела патрэба арганізацыі ў рэспубліцы спецыяльнага дзіцячага выдавецтва, што пара вырашаць многія іншыя наспелыя пытанні развіцця беларускай дзіцячай літаратуры, пра схематызм многіх падручнікаў па роднай літаратуры, пра недахопы ў складанні хрэстаматый і іншыя праблемы эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Ул. Юрэвіч затым спыняецца на пытанні прапаганды нашай літаратуры.

Таварыш П. М. Машэраў, працягвае Ул. Юрэвіч, у сваёй прамове на з'ездзе калгаснікаў слушна і своечасова заўважыў, «што вырашэнне праблемы станоўчага героя нашай сучаснасці заключаецца перш за ўсё ў звароце да гэтых людзей, людзей працы».

— Мы ўсе з вамі ведаем, як цікавіўся Уладзімір Ільіч мастацкімі скарбамі,— падкрэслівае Ул. Юрэвіч,—як шмат чытаў кніг прыгожага пісьменства. Прапаганда літаратуры, яе класічнай спадчыны была для Леніна адным з дзейсных сродкаў шырокай і ідэйнай асветы мас.

[Заканчэнне на 3-й стар.]

ПЕРШЫ КАДР

У АБ'ЕКТЫВЕ — ВЕКАПОМНАЕ...

«ЦІХА — ЗДЫМАЕМ!»

...Цар паморшчыўся. Генерал Аляксееў зайсёды назаляў яму дакладамі.

— Прабачце, ваша вялікасць. Тэрміновы запыт ад генерала Рузскага. У армію прыбылі новыя хуткаходныя аэрапланы. Па форме вельмі падобныя на нямецкія, без усякіх распазнавальных знакаў. Было ўжо некалькі выпадкаў, калі наша артылерыя збівала нашы ж аэрапланы...

— Так! — Мікалай глыбакадумна паклаў руку на стол. — А што калі наогул строга забараніць стральбу артылерыі па аэрапланах?

— Слухаю, ваша вялікасць... — генерал Аляксееў ледзь прыкметна ўздыхнуў і занатаваў нешта на паперы.

— Наша наступленне працягваецца? — запытаў цар.

— Ваша вялікасць! Мы наступаем для таго, каб немцы не думалі быццам мы наогул не здольны да наступальных аперацый. Нягледзячы на нашы вялікія страты... За апошнія два дні семнаццаць тысяч, — дадаў ён.

— На тое і вайна. Працягвайце наступленне! — па-будзённаму абыякава прамовіў Мікалай...

— Стоп, камера! Пагасіце, калі ласка, святло, — камандуе рэжысёр Уладзімір Уладзіміравіч Корш-Саблін. — Віншую з першым кадрам вас, таварышы!

Да рэжысёра падыходзяць акцёры, асістэнты, аператары — віншуюць, жадаюць удачы...

Сведкам гэтай падзеі я стаў, трапіўшы ў павільён студыі «Беларусьфільм».

Здымаецца новы шырокаэкранны мастацкі фільм «Крушэнне імперыі».

СЛОВА МАЕ РЭЖЫСЁР

Нялёгкая гэта задача — выкрасці ў рэжысёра некалькі свабодных хвілін для размовы. Чакаю гадзіну, другую... А рэжысёр яшчэ на капітанскім мосціку. Нарэшце мы ў яго рабочым пакоі.

— Многія чытачы, канечне, добра знаёмы з раманам Міхаіла Казакова «Крушэнне імперыі». На падставе гэтага твора М. Блейман і М. Каварскі напісалі сцэнарый,— гаворыць Уладзімір Уладзіміравіч. — Першы кадр яго ўжо адзняты на плёнку.

Самае важнае для нас — раскрыць духоўны свет герояў, тыя пачуцці і ідэйныя перакананні, якія кіруюць імі ў барацьбе.

Асноўным месцам здымак будуць вуліцы і плошчы горада на Няве. Мы добра памятаем словы У. І. Леніна: «Рэвалюцыя вырашана петраградскімі рабочымі... Петраград разбудзіў Расію. Петраград вызваліў яе». Гэтыя словы маглі б стаць эпіграфам да нашага фільма.

Зараз нашу здымачную групу хвалюе адна, здавалася б, не такая істотная дэталь. Мы заняты падборкай рэквізіту — такога, каб стварылася сапраўды рэальная, не бутафорская атмасфера дзеяння. Героі фільма будуць паказаны на строга дакументальным фоне.

— Уладзімір Уладзіміравіч, гледачоў заўсёды цікавіць, хто здымаецца ў галоўных ролях.

— У адной з вядучых роляў здымаецца папулярны беларускі акцёр тэатра і кіно Мікалай Яроменка. Ён стварае вобраз бальшавіка-рэвалюцыянера Ваўліна. Складаная і адказная роля, задача — даць партрэт выдатнага дзеяча партыі. На ролю Мікалая II мы выбралі таксама майстра беларускага тэатра Віктара Тарасава. Толькі не падумайце, калі ласка, што на гэты выбар зрабіла ўплыў яго выступленне ў гэтай жа ролі ў тэлевізійным спектаклі «Крах». Мы даўно трымалі яго на прыкмеце.

Праблема выканаўцаў асноўных роляў, а іх у фільме больш як трыццаць, вырашалася значна цяжэй. Спадзяюся, што акцёрскі ансамбль у нас будзе зладжаны.

...Гэта, відаць, так і будзе. Гартаючы аб'ёмісты рэжысёрскі сцэнарый, я здзіўляўся сузор'ю талентаў: Я. Самойлаў і А. Яфрэмаў, М. Стржэльчык і В. Белакураў, Л. Кміт і А. Грыбаў... І кожны з іх — гэта непаўторная старонка гісторыі савецкага тэатра і кіно.

Нашу размову з рэжысёрам абрывае тэлефон. «Знайшлі? Дзякуй!» — узрадавана крычыць Уладзімір Уладзіміравіч, і я здагадваюся, што гэта рэквізітары адшукалі нешта вельмі патрэбнае для таго, каб стварыць праўдзівую і гістарычна-дакладную атмасферу на здымках. Па голасе і вачах кінематаграфіста-ветэрана бачу, што гэта не дробязь.

— Дробязей у нашай працы не бывае наогул. А калі табе даручаюць узнавіць на экране людзей і падзеі вялікага 1917 года, адказнасць узрастае ўдвая. Таму мы не ведаем цяпер што такое спакой. Здымкі пачаліся... Бывайце!

Са стосу фатаграфій, якія можна назваць кадрамі будучага фільма, выбіраю некалькі. Гэта — пачатак кінаэпапеі. Паглядзіце на гэты здымак: бальшавік Ваўлін (М. Яроменка) у паядынку з генераламі Глобусавым (А. Грыбаў).

Вік. САЛАЎЕЎ.

СХОД МАСТАКОЎ-КАМУНІСТАЎ

Адбыўся справаздачна-перавыбарчы сход партыйнай арганізацыі Саюза мастакоў БССР. Камуністы абмеркавалі справаздачу сакратара партбюро А. Казлоўскага і задачы, якія стаяць перад мастакамі ў сувязі з 100-годдзем з дня нараджэння У. І. Леніна.

У спрэчках па дакладу выступілі В. Грамыка, В. Пратасеня, М. Гуціеў, І. Ахрэмчык, У. Стэльмашонак, П. Белавусаў, А. Гугель і іншыя.

На сходзе выбраны новы склад партыйнага бюро. У яго ўвайшлі В. Грамыка, М. Гуціеў, В. Пратасеня, Я. Зайцаў, С. Селіханаў, Г. Паплаўскі, У. Стэльмашонак, С. Каткоў, К. Кітаеў.

Сакратаром партбюро абраны У. Стэльмашонак, намеснікамі — М. Гуціеў і К. Кітаеў.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

Канвеер па нацягванні фартэп'янных струн... Музычны канвеер... Як толькі не завуць яго на Барысаўскай фабрыцы піяніна. Струну за струной перабіраюць чуйныя пальцы майстроў, і здаецца, што гэта цудадзеі і магі прымушаюць жыць сэрцы будучых музычных інструментаў.

Фота Ул. КРУКА.

ГІСТОРЫЯ КУПАЛАЎСКАГА ПАРТРЭТА

Па ўскрай Налібоцкай пушчы, на Іўеўшчыне, стаіць вёска Заберазь. Так сабе, не вялікая, не малая — хат пад дзвесце пяцьдзесят. Многа гора зведалі сяляне гэтай вёсачкі. Свайго хлеба тут не хапала спрадвеку. Батрачылі, ішлі ў плытагоны на Бярэзіну, наймаліся на другія работы.

Відаць, таму і наваўся тут люд моцны, раслі змагары за народнае шчасце, якія ўзнімаліся на барацьбу за лепшую долю, за волю.

У пачатку дваццатых гадоў у Заберазі была створана партыйная арганізацыя КПЗБ. Яна клікала на барацьбу людзей, вяла вялікую масава-палітычную работу. Але ж цяжка было гэта праводзіць. Усюды савалі свае насы сышчыкі Пілсудскага.

У 1927 годзе сяляне Заберазі дабіліся дазволу на адкрыццё беларускай бібліятэкі. Сабралі каля трохсот кніжак і размясцілі іх у хаце Наталлі Сямёнаўны Пратасевіч. Яе сыны Уладзімір і Іван былі падпольшчыкамі. Члены КПЗБ на сваім нелегальным сходзе рашылі, што бібліятэкай будзе загадваць Іван. Ён ахвотна ўзяўся за даручаную справу. Іван паехаў у Вільню і там дамовіўся з мастаком-самавучкай, каб той намаляваў партрэт Янкі Купалы. Неўзабаве партрэт у рамцы пад шклом вісеў у пакоі, дзе была бібліятэка. А бібліятэку назвалі Купалаўскай.

Вестка аб адкрыцці бібліятэкі абляцела навакольныя вёскі. Сюды бурлівымі ручаінамі пацяклі людзі. Яны ішлі, каб атрымаць кнігу, хто меў, нёс свой падарунак бібліятэцы. Хутка кніжны фонд яе вырас да тысячы кніжак. Была тут і забароненая літаратура, якая трымалася і чыталася патаемна.

Тут вяліся дыскусіі чытачоў, расказвалася аб жыцці ў СССР. Польская паліцыя многа разоў рабіла налёты на бібліятэку, абшуквала яе. Але як бы яна не старалася, бібліятэка існавала.

І толькі ў 1931 годзе польскім уладам удалося «прыдрацца» і закрыць яе. Кніжкі ўсе былі канфіскаваны. Наталлі Сямёнаўне ўдалося схаваць партрэт Янкі Купалы.

Арганізатары бібліятэкі, сыны Наталлі Сямёнаўны, Васіль і Іван перайшлі граніцу і пайшлі ў Савецкі Саюз.

У перадваенны час Наталля Сямёнаўна аддала на захаванне партрэт сваёй дачцы Марыі Фадзееўне. А хутка наступіла вайна. Гэтыя мясціны былі партызанскай зонай. Не раз і не два налятаалі сюды нямецкія карнікі. Яны шнырылі, рабілі вобыскі, спалілі дом Марыі Фадзееўны Махніцкай. Але ж і ў час пажару ёй удалося выратаваць партрэт песняра. Нават калі іх сям'ю гналі на захад, у Нямеччыну, яна змагла схаваць партрэт.

У пасляваенны час Марыя Фадзееўна аддала партрэт Янкі Купалы ў гістарычны музей Бакштаўскай сярэдняй школы. Вось такая цікавая гісторыя гэтай рэліквіі, якой зараз ганарацца нашчадкі забераўскіх падпольшчыкаў.

І. МІХАЙЛАЎ.

НАВАЛЬНІЧНЫМІ СЦЕЖКАМІ

У Яраслаўскай абласной газеце «Юнацтва» апублікавана дакументальная аповесць А. Зузульскага «Сцежкамі громаў і навальніц». У ёй расказваецца аб лёсе дзяўчынкі-валжанкі Шуры Шкурынавай, якая змагалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў партызанскіх лясах на Віцебшчыне. На падставе архіўных матэрыялаў, успамінаў партызан, а таксама пісьмаў самой гераіні, аўтару ўдалося ўзнавіць вобраз бясстрашнай дзяўчыны, якая загінула ў адным з баёў на тэрыторыі Суражскага раёна Віцебскай вобласці ў сорак трэцім годзе. Шмат цікавага чытач знойдзе ў аповесці пра беларускіх маладых партызан Уладзіміра Казлоўскага, Аляксандра Белахвосціка, Ніну Паўлоўскую, Васіля Лузгіна, Вадзіма Пазняка і іншых.

А. СТАДУБ.

г. Яраслаўль.

КІНО

КАВАЛКІ ВОПЫТУ І КІРУНАК ТВОРЧАСЦІ

Анатоль КРАСІНСКІ.

ВЫПАДАК, калі рэжысёр у працэсе пастаноўкі фільма намагаецца палепшыць яго драматургію, даволі тыповы. Праўда, як правіла, «барацьба» рэжысёра з дрэнным сцэнарыем рэдка прыносіць поспех. Калі драматургічная аснова слабая, церпіць ідэйна-мастацкія страты фільм. Але ўсё-такі кінатворы, якія стаяць вышэй за літаратурны сцэнарый, мы ведаем. Больш рэдкія выпадкі, калі фільм па раду прычын аказваецца слабейшы за сцэнарый. Да такога «нетыповага» выпадку трэба, бадай, аднесці новую работу кінастудыі «Беларусьфільм» «Чакай мяне, Ганна!», якую паставіў рэжысёр В. Вінаградаў па сцэнарыі Ю. Нагібіна (аператар Ю. Марухін).

Наколькі мне вядома, сцэнарый Ю. Нагібіна «Далёка ад вайны» (так ён першапачаткова называўся) быў найбольш цікавым кінадраматургічным творам з тых, што меліся ў свой час на студыі. Ён падкупляў свежасцю жыццёвага матэрыялу, уважлівым, паглыбленым паказам характару галоўнай гераіні — Ганны, дакладнымі прыкметамі часу.

Можа здацца, што вобраз Ганны не такі ўжо і новы. Бо ўжо былі карціны, дзе гераіня ў выніку пэўных жыццёвых акалічнасцей губляла веру ў людзей, а потым пад уплывам любімага чалавека зноў «знаходзіла сябе». Успомнім хоць бы фільм «Вышыня», стваральнікі якога вельмі пераканаўча раскрылі такую жыццёвую гісторыю. Але сутнасць справы, відаць, не ў ступені падабенства сітуацый, а ў тым, у якой меры характар героя арыгінальны, своеасаблівы, наколькі яго лёс здольны ўсхваляваць нас.

Ганна — жанчына нялёгкага лёсу. Яна праходзіць шлях цяжкіх выпрабаванняў. Былая дзетдомаўка, эвакуіраваная з Беларусі ў глыбокі тыл, мае мужчынскую прафесію, працуе кранаўшчыцай у рачным порце. У яе ёсць дзіця, але няма мужа. Бацька дзіцяці, яе таварыш па дзіцячым доме, на фронце. Ён піша Ганне пісьмы, але... сувязь іх была выпадковая, без сапраўднага кахання.

Суровае, неўладкаванае асабістае жыццё наклала свой адбітак на ўсё яе аблічча. Ганна грубаватая, прасталінейная, крыху цынічная. Будучае, відаць, — здаецца Ганне, — не абяцае ёй нічога добрага, жыццё не ўдалося і з гэтым нічога не зробіш. Грубасць, бравада, мужчынскія прывычкі для яе як бы ахоўная абалонка ад свету, ад людзей. Сустрэчы з карэспандэнтам газеты, былым франтавіком, паступова мяняюць Ганну, да яе прыходзіць каханне, першае сапраўднае каханне ў жыцці.

Старая і заўсёды новая ў мастацтве тэма высакароднага ўплыву на чалавека кахання!

Іменна аб гэтым, перш за ўсё, гісторыя, расказаная **кінадраматургам**. Але не толькі аб узаемаадносінах Ганны і карэспандэнта, не толькі аб каханні пісаў сцэнарыст. Жыццё Ганны, яе таварышаў і сяброўак — гэта яшчэ і працоўныя будні тылу, работа тых, хто разам з франтавікамі набліжае час нашай перамогі. Гэта яшчэ і атмасфера суровага і цяжкага часу.

Сцэнарый пры пастаноўцы быццам бы і захоўваўся. Я гавару «быццам», бо хоць асноўныя сюжэтныя калізіі сцэнарыя засталіся ў карціне, адбылася пэўная «пераацэнка каштоўнасцей», пэўнае пераасэнсаванне матэрыялу. У выніку фільм па сваёй накіраванасці — нешта **іншае**, чым сцэнарый.

Ставіць пытанне, — добра, ці дрэнна, калі рэжысёрская трактоўка разыходзіцца з трактоўкай сцэнарыста, наўрад ці правамерна. Гісторыя нашага кінематографа ведае нямала як адных, так і другіх прыкладаў. У дадзеным выпадку рэжысёрскае пераасэнсаванне сцэнарыя не пайшло на карысць фільму.

Дзіўнае ўражанне пакідае карціна «Чакай мяне, Ганна!» Пасля прагляду становіцца зразумелым, што ў ёй ёсць удалыя рэжысёрскія і акцёрскія знаходкі, ёсць выяўленчая культура ў аператарскіх здымках. І ў той жа час не можаш пазбавіцца ад унутранага супраціўлення многаму з таго, што ўбачыў на экране. Часам бывае проста няжка пагадзіцца з такой іменна рэжысёрскай інтэрпрэтацыяй падзей, іменна такой трактоўкай таго ці іншага вобраза, таму што не можаш суаднесці падобныя рашэнні з жыццёвай праўдай.

У рэжысёра свой погляд на вобраз Ганны. Ён і выканаўца ролі Ганны актрыса Святлана Жгун менш за ўсё клапоцяцца аб тым, каб раскрыць, як мяняецца Ганна пад уплывам вялікага кахання, як у гэтай грубаватай жанчыне абуджаюцца сардэчнасць, цеплыня, душа, якую можна лёгка параніць. Асноўныя акцэнты робяцца чамусьці на зусім іншым: на душэўнай чэрствасці Ганны, яе разбэшчанасці, вульгарнасці. Характар, **зададзены** ў самым пачатку, на працягу карціны толькі пацвярджае, што такім быў, такі ёсць і такім, відаць, хоча быць гэты чалавек, наўмысна жорсткі і пакутлівы. Рэжысёр вынаходліва дэманструе гэтую ўнутраную статыку вобраза. Гісторыі характару на экране няма!

Ганна сапраўды любіць карэспандэнта, ці сустрэчы з ім — толькі адзін з эпізодаў яе свабоднага і неўладкаванага жыцця? Пытанне далёка не пустое, бо тут самае важнае для мастака — **аб чым**, уласна кажучы, карціна расказвае гледачу. Аб'ектыўна атрымліваецца — хацеў гэтага рэжысёр ці не, — што знаёмства Ганны з карэспандэнтам — не больш чым звычайны, радавы эпізод яе біяграфіі. Узаемаадносіны герояў не даюць падстаў паверыць, што іх узаемаадносінамі кіруе вялікае пачуццё.

Мы бачым іх разам у порце, на танцах, у гасцях у цыркачоў, у доме, дзе жыве Ганна. І ні ў адной з названых сцэн рэжысёр і акцёры не даюць нам адчуць, што ў жыцці герояў адбываецца нешта вельмі важнае, значнае. Ганна пры ўсякім зручным выпадку дэманструе эксцэнтрычнасць сваёй натуры, а карэспандэнт, чалавек бясстрасны і халодны, з алімпійскім спакоем успрымае яе «дзікаватыя» паводзіны. Цяжка ўбачыць ва ўсім гэтым што-небудзь іншае, апрача звычайнай інтрыжкі, узаемнага жадання герояў прыемна і «арыгінальна» прамарнаваць час.

Алег Янкоўскі ў ролі карэспандэнта ў меру стрыманы, у меру верагодны і праўдзівы. І — шкада! — **унутраны свет** яго героя схаваны ад нас. Акцёр не дае нам больш-менш выразнага ўяўлення, аб чым думае, што на самай справе адчувае журналіст, сустракаючыся з Ганнай. Можа, і сапраўды знаёмства з грубаватай кранаўшчыцай — яркая падзея ў яго вандроўным жыцці? А, можа, наадварот?

Вельмі ўжо незразумела гаворыцца ў карціне аб з'явах надзвычай важных для разумення ідэйнай задумы стужкі.

Праўда, Ю. Нагібін усё ж Ю. Нагібін, і тады...

У фільме ёсць сцэна вяртання Ганны дамоў пасля наведвання цырка, сцэна без слоў, сцэна музычная. Тут настрой Ганны на дзіва паэтычна раскрыты праз яе адносіны да свайго дзіцяці. Магчыма я памыляюся, але мне здаецца, што гэта маленькая сцэнка-эцюд з пункту гледжання рэжысёрскага майстэрства зроблена бліскуча. Яна гучыць сціплым гімнам чалавеку, які нечакана для сябе ўбачыў свет «свежымі» вачыма, раптам зразумеў, што такое шчасце. І здаецца: нешта нагібінскае прарвалося на экран! Не! На жаль, сцэна выглядае ў агульнай плыні фільма ўстаўным нумарам, бо папярэднія падзеі ніяк не абумоўліваюць і не падрыхтоўваюць яе. Вельмі ўжо мала ва ўзаемаадносінах Ганны і карэспандэнта на экране лірычнай шчырасці, каб можна было ўспрымаць гэты эпізод у арганічнай сувязі з іншымі эпізодамі.

Карціна В. Вінаградава «Чакай мяне, Ганна!» — яго чацвёрты фільм. Усе ён будуе па, умоўна кажучы, прынцыпах «рэжысёрскіх» карцін. Прымат рэжысуры ў іх відавочны. Ён імкнецца да яркіх, кідкіх пластычных рашэнняў, вострых і выразных характарыстык. Аднак пошукі знешняй выразнасці ў яго работах не заўсёды прадыктаваны сэнсавымі задачамі твора. Фармальныя пошукі часцей за ўсё вядуць В. Вінаградава да неапраўданай ускладненасці кінамовы. А гэта — і да няпэўнасці аўтарскай пазіцыі. Красамоўнае сведчанне гэтаму — папярэдняя карціна рэжысёра «Усходні калідор».

Сцэнарый фільма, аб якім ідзе гутарка сёння, менш за ўсё меў патрэбу ў перабольшанай увазе да фармальных рашэнняў. У цэнтры — чалавечы лёс і, значыць, задача стваральнікаў фільма была ў аб'ёмным выяўленні **характараў герояў**. Рудыменты мінулых фармальных захапленняў рэжысёра, якія выяўляліся ў акцэнтаванні асноўнай увагі на знешняй экстравагантнасці кадра і эмацыянальных «выбухаў», адчуваеш і ў апошняй рабоце. У ёй нямала наўмысна напышлівага, прэтэнцыёзнага, што перашкаджае ўспрымаць вобраз Ганны ў бытавой і псіхалагічнай канкрэтнасці.

Ёсць цяжка ўлоўныя рэчы, дэталі ў паводзінах чалавека, у яго рэакцыі на тыя ці іншыя падзеі, у яго адносінах да навакольнага свету, якія характарызуюць людзей **свайго** часу, **пэўнага** этапу ў жыцці краіны, народа. Страта мастаком вось гэтага самага **адчування** часу, няўменне або нежаданне выказаць яго, адштурхоўваючыся ад рэальнага жыцця, прыводзіць урэшце-рэшт да прыкрых вынікаў. Глядач перастае верыць мастаку, ставіць пад сумненне прапанаваныя экранам жыццёвыя акалічнасці, логіку ўчынкаў персанажаў. Цяжка растлумачыць, напрыклад, паводзіны Ганны, якая **радасна** паведамляе свайму сябру-журналісту аб гібелі на фронце бацькі яе дзіцяці. Напэўна, у жыцці магчыма і такая выключная сітуацыя. Але ж яе неабходна неяк псіхалагічна абгрунтаваць!..

Значнае месца адведзена ў фільме цырку, людзям цырка, хоць апошнія наогул не маюць непасрэдных адносін да асноўных герояў і падзей кінакарціны. Цырк — не толькі месца забаў, дзе сустракаюцца многія героі пасля цяжкай штодзённай работы, ён яшчэ і своеасаблівы ўспамін аб мінулым, аб мірным жыцці. А яно ў тыя дні здаецца казкай. Няхай тое, што адбываецца на цыркавой арэне, выглядае не вельмі маляўніча, як выглядала ў мірныя дні, няхай добрую палавіну гледачоў складаюць ваенныя, параненыя са шпіталю, медсёстры — атмасфера ваеннага часу адчуваецца і тут — і ўсё-такі... Для Ганны, журналіста і яго сяброў — гэта нібы кавалачак дзівоснай рэчаіснасці, якая засталася там, у даваенным часе.

Цырк, здаецца, населены толькі добрымі, сімпатычнымі, мілымі людзьмі. Такія два немаладыя барцы, чалавечныя і душэўныя асілкі; ветлівая, бескарыслівая, спагадлівая да чужога гора сям'я цыркачоў. Таму зразумелы боль Ганны, калі яна даведваецца, што і ў ім, гэтым дзівосна-цудоўным свеце, сустракаюцца нягоднікі і падлюгі, накшталт кіраўніка трупы ліліпутаў, гатовага дзеля карыслівых інтарэсаў прынізіць чалавечую годнасць сваіх падначаленых.

На жаль, гаворачы аб «цыркавых» эпізодах, зноў нельга абысціся без «але». Рэжысёрская трактоўка аднаго з ключавых эпізодаў — назавём яго ўмоўна «баль з шашлыкамі» — робіць вельмі дзіўнае, калі не сказаць, прыгнятаючае ўражанне. Зноў, ужо ў каторы раз, адбываецца рэзкае перамяшчэнне акцэнтаў. Увага гледача канцэнтруецца галоўным чынам на асобе мярзотніка, які прагна жарэ шашлыкі і з нейкім садысцкім задавальненнем расказвае прысутным аб сваіх гнюсных хітрыках з бездапаможнымі, безабароннымі ліліпутамі. На экране раптам з'яўляецца нейкі тылавы Іудушка, які бессаромна, не баючыся прысутных, нахабна дэманструе сваю абсалютную пагарду да элементарных норм маралі.

Адмоўнае стаўленне Ганны (чытай: і аўтараў) да гэтага самавыкрыцця тут ужо не здаецца істотным, бо ў фокусе ўвагі рэжысёра зусім іншае: дэталёвае **даследаванне** паводзін **мярзотніка**. Цяжка паверыць у жыццёвасць такога выкрыцця наогул, тым больш у такіх абставінах, у якіх яно адбываецца. Можа, такая гісторыя прагучала б у якім-небудзь іншым фільме, скажам, сатырычнай камедыі, а ў карціне «Чакай мяне, Ганна!» — творы пэўнай задачы, пэўнай стылістыкі — яна выглядае **надуманай**.

І справа тут не толькі ў страце пачуцця мастацкай меры. Мне здаецца, што ў гэтым эпізодзе асабліва выразна адчуваеш **тэндэнцыю** творчасці рэжысёра, якая найбольш поўна праявілася ва «Усходнім калідоры»: пільная ўвага да жорсткага, агіднага, алагічнага ў чалавеку. Гэта тэндэнцыя ў фільме «Чакай мяне, Ганна!» недзе існуе падспудна, а недзе раптам ярка прарываецца і на паверхню. Тады і з'яўляецца эпізод «баль з шашлыкамі», з дэфармаваным святлом тварамі персанажаў, з нягоднікам, які выкрывае да канца сваю подлую сутнасць.

Нічога не скажаш. людзі, якія здымалі эпізод, дэманструюць выдатны «чыста-прафесійны» прыём. Яны добра валодаюць сродкамі сучаснага кінематографа. Але ж — **у імя чаго?** Чаму, якой **мэце** падначалена высокая прафесіянальная культура стваральнікаў фільма?

Пераймаць буйнейшых майстроў Захаду — Бергмана або Бюнюэля — і верыць, што тым самым ты ідзеш у кільватэры сучаснага кінематографа, глыбокая памылка. Няўдзячная гэта справа — па-рамесніцку пераносіць з чужароднай глебы знойдзенае іншымі, хаця б і вялікімі мастакамі.

Мастацкая неаб'ектыўнасць рэжысёра, аб якой ідзе гутарка, не такая бяскрыўдная, як гэта здаецца на першы погляд. Бо карціна «Чакай мяне, Ганна!» — адзін з пакуль яшчэ вельмі нешматлікіх кінатвораў аб Вялікай Айчыннай вайне, дзе паказаны працаўнікі тылу. Зразумела, што ні сцэнарыст, ні рэжысёр не ставілі перад сабой задачы ўсебаковага паказу самаадданай работы людзей, якія ахвяравалі сабой дзеля перамогі. Прад'яўляць аўтарам прэтэнзіі, што яны, маўляў, не імкнуліся шырока і аб'ёмна паказаць жыццё тылу, наўрад ці правільна. У фільма былі свае, больш сціплыя мэты і задачы. Але якім бы ні быў **камерны** сюжэт твора, у ім, натуральна, не маглі не знайсці адлюстравання **істотныя** бакі і **тэндэнцыі** жыцця таго перыяду.

У гледача, які сочыць за лёсам герояў і вызначае да іх свае адносіны, абавязкова складваецца таксама і **вобраз часу**, таго часу, калі адбываюцца падзеі фільма. Ці дае фільм гледачу, асабліва маладому, для якога мінулая вайна далёкая гісторыя, правільнае, абгрунтаванае на матэрыяле рэальнай рэчаіснасці ўяўленне аб жыцці ў тыле, аб людзях тылу? Думаю, што па прычынах, аб якіх ужо гаварылася вышэй, не дае, хоць у кінатворы ёсць эпізоды, кадры «настраёвага» характару, дзе атмасфера часу, яго прыкметы, перададзены дакладна і выразна (панарама горада ў пачатку і сярэдзіне карціны, праход воінскай часці, твар стомленай, многа перажыўшай жанчыны з папяросай і іншыя моманты). Але з мазаікі выдатных кавалкаў не складзеш мастацкі твор — патрэбна **кіруючая** мастацкая ідэя.

Адзіны вялікі эпізод карціны, прысвечаны працоўнай дзейнасці Ганны і яе сяброўак — эпізод разгрузкі баржы — драматургічна і рэжысёрскі зроблены настолькі сумбурна, незразумела і блытана, што нават вопытнаму гледачу, бадай, цяжка разабрацца ў сутнасці таго, што адбываецца. Застаюцца ў памяці ад гэтай мітуслівай сцэны светлавыя эфекты, якімі шчодра карыстаецца аператар. Выглядае гэта, канечне, уражліва, але зноў жа не ў іх, не ў аператарскіх эфектах справа.

Рацыяналізм, нястрымнае жаданне адвольна канструяваць вобразы і падзеі па свабоднай «фантазіі» рэжысуры выхаласцілі з фільма праўду жыцця, праўду мастацтва. Пункт гледжання мастака падменены тут, як гаварыў М. Горкі, «кочкай» гледжання. З гэтай так званай «кочкі» добра бачыцца ўласнае «я» аўтара-рэжысёра, але з «кочкі» немагчыма разгледзець філасофскую сутнасць часу.

Было б у вышэйшай ступені неразумна патрабаваць ад мастака паказваць працаўнікоў тылу нейкімі анёламі, людзьмі «без сучка і задзірынкі». Не аб гэтым ідзе гаворка. Складаны, цяжкі быў час і ўсякае было. Але была вялікая вайна за свабоду, за незалежнасць Радзімы, за будучае. Людзі аддавалі ўсё, каб перамагчы моцнага, жорсткага ворага. І яны перамаглі. Перамагло лепшае, што было ў іх. Аб гэтым трэба помніць. Аб гэтым трэба гаварыць з экрана. Дзеля гэтага варта жыць і працаваць у мастацтве.

Творчая біяграфія рэжысёра В. Вінаградава няўдала склалася ў беларускім кіно. Калі б гутарка ішла пра чалавека няздатнага, не варта было б, напэўна, вакол яго карцін ламаць столькі коп'яў. Але справа складваецца некалькі інакш. Карціны «Дзень, калі спаўніцца трыццаць гадоў», «Пісьмы да жывых», «Усходні калідор», «Чакай мяне, Ганна!» ставіў кінематаграфіст несумненна здольны. Бяда рэжысёра заключаецца ў тым, што яго творчая энергія, яго мастацкія пошукі бываюць падначалены памылковым, надуманым канцэпцыям. Тут бачу я асноўную прычыну, якая прывяла да сур'ёзных памылак у фільме «Пісьмы да жывых», да сакрушальнага правалу «Усходняга калідора», да няўдачы апошняй карціны.

Зводзіць гэтыя няўдачы да пралікаў маладосці — значыць быць вельмі паблажлівым і нічога не растлумачыць. Узрост рэжысёра, жыццёвы і кінематаграфічны, такі, што рабіць скідкі на маладосць ужо нельга. Думаю, што для падмацавання сваёй думкі, не варта мне тут называць выдатныя класічныя творы савецкага кінамастацтва, якія ствараліся людзьмі такога ж узросту, а то і больш маладымі. Проста такое пералічэнне заняло б вельмі многа месца і часу.

У сваіх няўдачах рэжысёр вінаваты перш за ўсё сам. Гэта несумненна. Але для мяне несумненна і другое. У асяроддзі кінематаграфістаў рэспублікі не хапае сапраўды творчай атмасферы, сяброўскіх, па-таварыску прынцыповых дыскусій і творчых спрэчак, што прыводзіць да тых адмоўных з'яў, аб якіх ідзе гутарка. Кінематаграфісты, на жаль, часам забываюць аб самым галоўным, аб тым, ад чаго залежыць лёс беларускага экраннага мастацтва — аб фарміраванні **асобы** мастака.

НАШЫ *майстры* МАСТАЦТВА

ПОШУК І ПРАЦА

Народнаму артысту БССР С. Бульчыку — 60 гадоў

ЁСЦЬ пэўныя своеасаблівыя адценні ў тым, як будуюцца ўзаемаадносіны паміж акцёрам і гледачом, паміж акцёрам і драматургам. Але часцей за ўсё служба на сцэне — гэта сумесная праца артыста і рэжысёра. Я і хачу расказаць аб тым, як мы супрацоўнічаем з Сяргеем Бульчыкам. Гаворка гэта своечасовая — з нагоды яго юбілею.

Пачну з таго, што гутарыць з Сяргеем Сцяпанавічам пра ролю, якую ён атрымаў у спектаклі, заўсёды вельмі цікава. Назіральны і ўдумлівы, ён яшчэ і вельмі «ўчэпісты» акцёр. Што гэта такое? Калі выканаўца «бярэ» тэкст ва ўсёй сутнасці праблем, што закранаюцца ў п'есе гэтым характарам, гэтым тыпам. Ён «прыглядаецца» да героя, ён узважвае яго чалавечыя і грамадзянскія якасці, разгадвае матывы паводзін. І правярае разам з намі, з рэжысёрамі, ці здолеў «разгадаць» гэтую асобу. Тут яму, канечне, дапамагаюць розныя літаратурныя крыніцы — каментарыі, даследаванні, тлумачэнні аўтараў і крытыкі. Аднак куды даражэй Сяргею Сцяпанавічу да ўсяго дайсці ўласным розумам. І сэрцам. Так, асэнсаваць сэрцам тое, што адбываецца з героем, мабыць, галоўная яго мэта.

Мэта ёсць. Цяпер пачынаецца «нацягванне скуры» вобраза на сябе. Здаецца, акцёр «забыў» тое, аб чым гаварылі яму рэжысёры і наогул — нібы не было папярэдніх размоў. Ты сочыш за героем Бульчыка і цябе здзіўляе, як арганічна ён «перабудоўваецца» на сцэне — не, гэта не Сяргей Сцяпанавіч, гэта той, пра каго нешта сказаў драматург.

І тут варта адзначыць самую каштоўную рысу характару Сяргея Сцяпанавіча — незвычайную праўдзівасць усяго таго, што ён робіць. Прыгадваецца работа С. Бульчыка над вобразам Гардзея Уласава ў п'есе маладога драматурга Л. Караічава «Мала сказаць люблю» («І выхавай сына»). Больш двух год давялося мне працаваць з аўтарам п'есы. Нарэшце, ён прапанаваў свой «апошні варыянт», які, на жаль, не задаволіў творчы калектыў тэатра. Я адчуў, што аўтар стаміўся, а галоўнае, згубіў веру, што яго п'еса калі-небудзь будзе пастаўлена. Большасць мастацкага савета тэатра выказалася за тое, каб рэпетыцыі па незавершаным творы не пачынаць. І тады С. Бульчык пераканаўча даказвае, што аўтару трэба памагчы не толькі парадай, а і практычнай работай. У часе рэпетыцый аўтар лепш зразумее, што ад яго хоча тэатр, акцёры і рэжысёр.

Рэпетыцыі пачаліся. Нямала зрабілі акцёры М. Радзіёнаў, Ю. Труханаў, В. Суднікава, І. Хацялоўская, Ю. Колчын. Яны прасілі аўтара выкінуць тое, што ім перашкаджала ў рабоце, дапісаць новае. А вось Бульчык, які прымаў актыўны ўдзел у нараджэнні новага спектакля, беражліва паставіўся да аўтарскага тэксту, нічога ў п'есе не мяняў і не выкрэсліваў. Ён гаварыў, што разумее патрабаванi рэжысёра, але паспрабуе на тым матэрыяле, які мае, стварыць вобраз урача. І як радаваўся наш калектыў, калі было ўжо відавочна, што хірург Уласаў заняў у спектаклі тое месца, якое яму і належала.

Так нарадзіўся спектакль, праўда, непазбаўлены недахопаў. Але ён заняў у нашым рэпертуары трывалае месца. За тры гады мы ставілі яго 260 разоў! У спектаклі з'явіліся ўжо новыя выканаўцы, якія іграюць таксама з захапленнем. І ўсё ж я вельмі люблю вечары, калі заняты стваральнікі спектакля (мы іх называем сааўтарамі) і асабліва, калі разам на сцэне выступаюць Радзіёнаў і Бульчык. Тады на сцэне сапраўднае свята!

Шырокі творчы дыяпазон у С. Бульчыка. Вось няхітры, прастадушны, з яркім сялянскім характарам, улюбёны ў сваю працу Лявон з «Лявонiхі на арбіце» А. Макаёнка і глыбока інтэлігентны прафесар Акаёмаў у «Машаньцы» А. Афінагенава. Бунтар і важак сялянскай масы Дзяніс у п'есе «Мурын Бор» І. Ісачанкі і пырхлівы амурчык, інтрыган фон Кальб у «Каварстве і каханні» Ф. Шылера. Адзін з кіраўнікоў Магілёўскага падполля, стойкі і валявы Андрэй Мартыновіч з п'есы «Гэта было ў Магілёве» Я. Тарасава і слізкі, крывадушны генерал Духонін у «У гадах навальнічных» К. Губарэвіча. Асцярожны, халодны балбатун ойча Паўлін у «Ягоры Булычове» М. Горкага і палымяны змагар за праўду Шыковіч у «Сэрцы на далоні» І. Шамякіна. Бюракрат, хамлюга і пустазвон Мамантаў у «Жанатым жаніху» Г. Штайна і І. Кузняцова і ласкавы бязвольны дурніца Везінэ ў вадзвілі «Саламяны капялюш» Лабіша. Я назваў толькі некаторыя ролі, сыграныя С. Бульчыкам за апошнія пяць гадоў. Разнастайная галерэя людзей, і кожны з іх мае яркія індывідуальныя рысы характару. І ў той жа час гэтыя вобразы створаны ў адзіным стылі, уласцівым толькі С. Бульчыку.

Акцёр любіць працаваць над новымі п'есамі, у якіх можна стварыць свежы, арыгінальны вобраз, а калі Сяргей Сцяпанавіч працуе над класічнымі творамі, то ён абавязкова ўнясе ў знаёмы вобраз нешта нечаканае, і адразу роля становіцца самабытнай, бульчыкаўскай.

Хачу спыніцца на вельмі важным этапе ў творчым жыцці народнага артыста і яго рабоце над вобразам Леніна ў п'есах М. Пагодзіна «Крамлёўскія куранты» і «Трэцяя патэтычная» і М. Шатрова «Імем рэвалюцыі».

Самае галоўнае, чаго дамогся акцёр, гэта сінтэз вельмі простага чалавека і філосафа, мысліцеля і арганізатара, правадыра і чалавекалюба. Зразумела, любому таленавітаму акцёру цяжка авалодаць нават часткаю таго, што канцэнтруецца ў ёмістым слове «Ленін». Але важна, мне здаецца, што калі глядзіш на акцёра, які іграе ролю Леніна, верыш у тое, што ёсць нешта ленінскае ў створаным вобразе. Калі я глядзеў на С. Бульчыка, я верыў гэтаму.

Цяпер пра Бульчыка ў жыцці. Сяргей Сцяпанавіч надзвычай просты і шчыры чалавек, часцей за ўсё ў тэатры яго бачаць сярод моладзі. Ён для іх — прыклад, варты пераймання. Я не прыгадаю выпадку, каб Сяргей Сцяпанавіч прыйшоў на рэпетыцыі непадрыхтаваным. Пачынаецца рэпетыцыя, і акцёр адразу пераўвасабляецца. Працаваць з ім вялікае шчасце.

Біяграфія народнага акцёра нескладаная. Сяргей Сцяпанавіч у 1929 годзе закончыў у Мінску школу. Вучыўся на курсах радыстаў, а пасля працаваў на радыёстанцыі. Служыў у Чырвонай Арміі. З 1934 года вучыцца ў студыі пры тэатры імя Я. Купалы. Пасля яе заканчэння застаўся працаваць у гэтым тэатры. У 1939 годзе Сяргея Сцяпанавіча разам з групай творчай моладзі накіроўваюць працаваць у Заслаўскі калгасна-саўгасны тэатр. Пасля ўз'яднання заходніх абласцей Беларусі ў адзіную Савецкую дзяржаву гэты тэатр пераязджае ў Пінск, дзе ствараецца абласны драматычны тэатр. У час Вялікай Айчыннай вайны С. Бульчык знаходзіцца ў дзеючай арміі. Быў цяжка паранены. Пасля дэмабілізацыі зноў вярнуўся ў Пінскі тэатр. У 1946 годзе ён разам з тэатрам пераязджае ў Магілёў, дзе працуе па сённяшні дзень.

Такі наш юбіляр — просты шчыры, таварыскі, улюбёны ў тэатр чалавек.

Б. ВАЛАДАРСКІ,
заслужаны дзеяч мастацтваў
Марыйскай АССР.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Беларускі тэатр юнага гледача паказаў новы спектакль «Ваўкі і авечкі» па п'есе А. Астроўскага. Пераклад К. Крапівы. Рэжысёр спектакля Т. Белічэнка, мастацкае афармленне А. Салаўёва.

У спектаклі заняты артысты П. Ротэр, В. Кліменка, Л. Цімафеева, У. Говар-Бандарэнка, А. Фурманава, В. Турмовіч, Э. Шаміёнка, А. Каляда, Л. Улашчанка і інш.

На здымку — сцэна са спектакля. У ролі Мурзавецкай — артыстка П. Ротэр, Купавінай — заслужаная артыстка БССР Л. Цімафеева.

Фота Ул. КРУКА.

«САТЫРА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА МІР»

Так называецца міжнародная выстаўка твораў мастакоў-сатырыкаў, якая адкрылася 17 лістапада ў Маскве ў залах Акадэміі мастацтваў СССР. Яна арганізавана па ініцыятыве Савецкага Камітэта абароны міру, пры ўдзеле Савецкага фонду міру, Саюзаў мастакоў СССР і РСФСР, Міністэрства культуры СССР і Саюза журналістаў СССР.

На выстаўцы экспануюцца сатырычныя творы мастакоў многіх братніх рэспублік нашай краіны, работы мастакоў Балгарыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Румыніі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Югаславіі. Тут прадстаўлена і творчасць прагрэсіўных мастакоў Францыі, Італіі, Даніі, Чылі, Злучаных Штатаў Амерыкі.

У выставачны камітэт, які займаўся адборам экспанатаў на выстаўку, побач з такімі вядомымі майстрамі сатырычнага малюнка як Кукрыніксы, Б. Яфімаў, А. Канеўскі, Я. Шукаеў, М. Абрамаў, уваходзіў і беларускі мастак В. Ціхановіч.

У гутарцы з нашым карэспандэнтам ён расказваў:

— Работа была вельмі напружанай. За некалькі дзён мы ўсе разам са старэйшым мастаком-сатырыкам Барысам Яфімавым павінны былі адабраць для экспазіцыі 600 лепшых работ. Ад творчых саюзаў у гэтай справе ўдзельнічалі украінец В. Літвіненка, эстонец Х. Хібус, грузін А. Ламідзе і таджык Д. Расулаў.

Вядучая тэма экспазіцыі — выкрыццё імперыялізму, каланіялізму, нямецкага рэваншызму, амерыканскай і ізраільскай агрэсіі супраць свабодалюбівых народаў. Мне прыемна, што тут знайшлося месца і для майго сатырычнага малюнка «Бонскае птушаня». Гэты малюнак — мой пратэст супраць рэваншысцкіх прошукаў бундэсвера. Малюнак—памерам амаль з газетную паласу — выкананы чорнай тушшу.

23 лістапада лепшыя творы ўдзельнікаў выстаўкі былі адзначаны прэміямі, ганаровымі дыпломамі і памятнымі падарункамі творчых і грамадскіх арганізацый. Мастакі, творчасць і дзейнасць якіх шмат гадоў звязана з барацьбой за абарону міру, узнагароджаны спецыяльнымі медалямі.

Як стала вядома, у ліку іншых, прадстаўнік БССР мастак В. Ціхановіч узнагароджаны за сваё баявое мастацтва ганаровай граматай Міжнароднай выстаўкі «Сатыра ў барацьбе за мір» і медалем Савецкага фонду міру.

Трэба адзначыць, што Саюз мастакоў БССР мог бы паслаць на гэтую выстаўку значна больш твораў нашых майстроў сатыры, тым больш, што яны ў нас ёсць. Тут сказалася неаператыўнасць праўлення творчага саюза.

І. СУЧКОЎ.

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНСКІХ ІДЭЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наша журналістыка, наша літаратура, гаворыць Ул. Юрэвіч, заканчваючы сваё выступленне, павінна яшчэ ў большай ступені стаць не толькі крыніцай рацыянальнага пазнання свету, але і часткай нашай духоўнай сутнасці. Таму, што наша літаратура піша аблічча часу, стварае вобраз сучасніка, мацуе сувязь эпох і пакаленняў.

На трыбуне — Сяргей Грахоўскі.

— Кожны з нас разумее і заўсёды з удзячнасцю помніць, — гаворыць ён, — што росквітам беларускай літаратуры, мастацтва, навукі і культуры, усяго нашага жыцця мы абавязаны рэвалюцыі, Кастрычніку, клопатам партыі і вялікаму Леніну — стваральніку нашай дзяржавы. Яму, вечна жывому і бясконца дарагому і блізкаму, мы прысвячаем свае лепшыя творы, свае самыя чыстыя помыслы і здзяйсненні. Лічу за гонар, што мне давялося ўдзельнічаць у складанні зборніка лепшых нашых твораў, прысвечаных Уладзіміру Ільічу. Мы яшчэ раз пераканаліся ў сваім багацці, знаходзячы для гэтага зборніка натхнёныя, напісаныя гарачым сэрцам радкі, поўныя любві і адданасці Ільічу, нашай агульнай справе, у імя якой жыў, працаваў і змагаўся Ленін.

Гаворачы аб тым, што ў гэты юбілейны зборнік не трапілі творы рамесныя, змайстраваныя метадам халоднай штампоўкі, прамоўца адзначае, што, тым не менш, гэта не азначае, быццам такіх твораў няма. Ён з абурэннем гаворыць, што творы такія, на жаль, існуюць, пішуцца і нават друкуюцца, што замест таго, каб да твораў пра Леніна, партыю і Радзіму прад'яўляць самыя высокія патрабаванні, у рэдакцыях некаторых газет, наадварот, ім даюцца недарэчныя скідкі: маўляў, тэма важная.

— Ад празмернага ўжывання, — гаворыць далей С. Грахоўскі, — сціраецца, ліняе, амартызуецца не толькі рэч, але і слова. Яно траціць сваю цану, сваю сілу і каштоўнасць. Рыхтуючыся да ленінскага юбілею, мы павінны часцей заставацца сам-насам з Ільічом, чытаць яго вечна жывыя творы, вучыцца ленінскай прынцыповасці, сціпласці, самаадданасці, глядзець на падзеі і з'явы нашага часу з ленінскіх пазіцый.

Прамоўца гаворыць аб вялікай грамадзянскай і маральнай адказнасці пісьменніка, які бярэцца за напісанне твора пра Уладзіміра Ільіча, аналізуе творы ленінскай тэматыкі, напісаныя В. Хомчанкам, І. Шамякіным, Я. Бяганскай, А. Вялюгіным. Паэму А. Вялюгіна «Вецер з Волгі» прамоўца лічыць найбольш таленавітай і натхнёнай працай у нашай паэзіі пра Уладзіміра Ільіча і выказвае здзіўленне, што да гэтага часу твор не ўключаны ў школьныя праграмы, гаворыць пра тое, што ўвогуле трэба больш аператыўна дапаўняць школьныя падручнікі лепшымі ўзорамі сучаснай паэзіі і прозы, шырэй знаёміць вучняў і студэнтаў з творамі старэйшых і маладзейшых пісьменнікаў, не абмяжоўвацца вузкім колам імёнаў і твораў і адпаведна павялічыць колькасць гадзін на вывучэнне роднай літаратуры.

Пагаджаючыся з тым, што гаварыў Ул. Юрэвіч аб палепшанні прапаганды твораў беларускай літаратуры, С. Грахоўскі таксама выказвае шэраг заўваг па гэтым пытанні. У прыватнасці, ён адзначае, што, на яго думку, часам вельмі патрэбныя і карысныя кнігі выходзяць заніжаным тыражом, што не ў кожнай школе, клубе ці бібліятэцы можна знайсці камплекты «Полымя», «Маладосці», падшыўку газеты «Літаратура і мастацтва», што нярэдка вялікія намаганні нашых пісьменнікаў трацяцца не па-гаспадарску, што яны не даюць таго эфекту ўздзеяння на масы, які б яны маглі мець.

— Няхай мне прабачаць, — заўважае ў сувязі з гэтым прамоўца, — што ў пярэдадзень вялікага юбілею, на перадсвяточным пленуме я загаварыў пра дробязі. Але ў вялікай справе і дробязі бываюць істотныя. Знаходзіў жа Уладзімір Ільіч час і сілы ў кіпенні вялікіх дзяржаўных спраў клапаціцца пра дабрабыт кожнага, дбаць пра кожнага таварыша, якую б пасаду гэты таварыш не займаў. Чым часцей мы будзем звяртацца да крыніц ленінскай мудрасці, чысціні, прастаты, сціпласці і ўважлівасці, чым настойлівей будзем, кажучы словамі Маякоўскага, «себя под Лениным чистить», тым святлей, паўней і радасней будзе жыццё нашага народа, тым большымі будуць нашы здабыткі ў эканоміцы, навуцы, культуры і мастацтве. Кожнаму з нас хочацца ў меру сваіх здольнасцей і сіл зрабіць больш і лепш для нашага народа, глыбока, усхвалявана і сумленна расказаць пра наш велічны час, асветлены геніем вялікага Леніна.

— Кожны дзень набліжае нас да вялікага свята — 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, — гаворыць Хведар Жычка. — У гэтыя дні мы не толькі з вяршыні нашых дасягненняў аглядаем пройдзены шлях, але і звяраем сябе па Леніну: ці ўсё я раблю так, як завяшчаў Ленін, ці стаў я такім, якім марыў бачыць Ленін савецкага чалавека праз паўстагоддзя пасля рэвалюцыі? І мы зноў і зноў звяртаемся да геніяльных твораў Ільіча як да невычэрпнай крыніцы ведаў і мудрасці, і кожны раз знаходзім для сябе нешта новае, што дапамагае нам глыбей зразумець сённяшні дзень.

Нас, пісьменнікаў, працягвае прамоўца, у першую чаргу цікавяць выказванні Леніна аб выхаванні новага чалавека — будаўніка камунізма, аб развіцці чалавечай асобы. На працягу ўсяго свайго жыцця Ленін развіваў і паглыбляў вучэнне аб камуністычным выхаванні, аб камуністычнай маралі. Уладзімір Ільіч рашуча адхіляў антынавуковыя погляды пра вечнасць і нязменнасць маральных норм, падкрэсліваў гістарычную і класавую сутнасць маралі. Ён адзначаў, што ў адрозненне ад буржуазнай маралі, якая дапамагае замацоўваць панаванне эксплуататарскіх класаў, камуністычная мараль служыць справе аб'яднання ўсіх працоўных дзеля барацьбы за свабоду і роўнасць, вынікае і развіваецца ў працэсе гэтай барацьбы. Выхаванне новага чалавека ў адрыве ад жыцця, ад барацьбы немагчыма. А неад'емнай умовай развіцця асобы з'яўляецца дзейнасць самога чалавека, яго актыўнасць.

На вялікі жаль, у апошні час, гаворыць Хв. Жычка, з'явілася нямала твораў, асабліва апавяданняў, у якіх амаль не знойдзеш героя, які б рабіў нешта карыснае, быў бы нечым заняты. З апавядання ў апавяданне вандруе гэтакі глыбакадумны малады чалавек, якому ўсё на белым свеце не да спадобы, нешта гняце, мучыць яго, а што — ён і сам добра не ведае. Жыве гэты герой не ў канкрэтнай, а ў нейкай абстрактнай абстаноўцы, думкі яго таксама неканкрэтныя, засяроджаныя вакол дробязей быту, праз якія ён нібыта спазнае сябе. І дзіўнае не столькі ў тым, падкрэслівае прамоўца, што такія творы з'яўляюцца, а ў тым, што яны знаходзяць абаронцаў-крытыкаў, якія выстаўляюць іх ледзь не эталонамі сучаснай літаратуры, прыдумалі для іх гучныя, хоць і не зусім ясныя азначэнні, накшталт «інтэлектуальная проза», «лірычная проза», «паток жыцця» і г. д.

А між тым, зазначае Хв. Жычка, у нашай літаратуры за апошні час былі з'явы, міма якіх не прайшоў бы, здаецца, ніякі крытык. У прыватнасці, ён называе аповесці «Праклятая вышыня» і «Круглянскі мост» В. Быкава, зборнік вершаў А. Вярцінскага «Чалавечы знак» — творы, якія, на яго думку, з'яўляюцца не проста няўдачамі аўтараў, а маюць сур'ёзныя ідэйна-мастацкія пралікі. Крытыкі ж, прыкрыўшыся фігавым лістком абстрактнай мастацкасці, прайшлі міма іх, як гадамі праходзяць міма твораў пісьменнікаў, творчая манера якіх ім не падабаецца.

Далей Хв. Жычка спыняецца на рабоце выдавецтва «Беларусь», дзе ён працуе загадчыкам рэдакцыі мастацкай літаратуры. У гэты юбілейны год, гаворыць ён, работнікі выдавецтва працавалі і працуюць вельмі напружана. Яны ў асноўным закончылі здачу рукапісаў гэтага года да 1 жніўня і цяпер працуюць над планам 1970 года. Частка рукапісаў кніг, якія пабачаць свет у будучым годзе, ужо здадзена ў набор. Сярод іх — дзве аб'ёмныя і важныя юбілейныя кнігі — зборнік лепшых твораў беларускіх пісьменнікаў пра Леніна, партыю і Радзіму пад назвай «З Леніным заўсёды Беларусь» і зборнік да 25-годдзя з дня перамогі пад назвай «Шлях да перамогі».

Канчаючы сваё выступленне, Хв. Жычка гаворыць:

— У рабоце нашай рэдакцыі ёсць, вядома, і недахопы. Але яны заключаюцца не ў тым, што мы празмерна патрабавальныя. Наадварот, нашы рэдактары часам бываюць занадта памяркоўныя, даюць пуцёўку ў жыццё творам слабым, пры ацэнцы рукапісаў кіруюцца сваім густам, а не высокімі партыйнымі крытэрыямі. Не на поўную нагрузку працуе наш рэдсавет, рэдка прыцягваем мы вядомых майстроў слова для грамадскага рэцэнзавання і рэдагавання рукапісаў. Гэтыя недахопы мы выпраўляем і будзем выпраўляць. Мы прыслухоўваемся і будзем прыслухоўвацца да думкі грамадскасці, спадзяёмся наладзіць больш цесны кантакт з творчымі секцыямі Саюза пісьменнікаў, кантакт творчы, заснаваны на ўзаемным усведамленні высокай адказнасці, якую мы нясём перад народам у справе камуністычнага выхавання нашага сучасніка — будаўніка камунізма.

Аб высокай і адказнай місіі савецкага пісьменніка гаварыў у сваім выступленні Аляксей Слесарэнка. Пісьменнік, падкрэсліў ён, павінен быць грамадзянінам, жыць інтарэсамі і справамі свайго народа, толькі тады ён зможа сказаць важкае і патрэбнае слова, толькі тады творы яго будуць напоўнены пафасам стваральнай працы, пафасам камуністычнага будаўніцтва, толькі тады кнігі яго знойдуць дарогу да сэрцаў шматлікіх чытачоў і ўсхвалююць гэтыя сэрцы. У пісьменніцкім асяроддзі, зазначыў прамоўца, не павінна быць месца зайздрасці, самазаспакоенасці, самазакаханасці, бо ўсё гэта губіць мастака: ён губляе над сабой творчы кантроль і перастае ўдасканальвацца.

А. Слесарэнка закрануў таксама некаторыя пытанні развіцця нашага музычнага мастацтва. У прыватнасці, ён гаварыў аб той музычнай макулатуры, якая часам запаўняе вагоны цягнікоў, паркі, рэстараны і кафэ, рачныя прычалы, студэнцкія інтэрнаты, эстрадныя пляцоўкі і канцэртныя залы, што Саюзу пісьменнікаў трэба ўсямерна мацаваць творчыя кантакты з Саюзам кампазітараў для стварэння сапраўдных масавых сучасных песень. Пытанне гэтае не такое дробязнае, як можа падумаць сёй-той з таварышаў.

Частку сваёй прамовы П. Васілеўскі прысвяціў ленінскай тэме ў драматургіі. Адзначыўшы, што тэма гэтая невычэрпная, што чым далей аддаляемся мы ад таго часу, калі жыў, змагаўся і працаваў Уладзімір Ільіч, тым усё цяжэй становіцца распрацоўваць гэтую тэму, тым усё большая адказнасць кладзецца на мастака.

Дысанансам агульнай гаворцы, якая адбылася на пленуме, прагучала выступленне Аляксея Карпюка. У яго прамове было шмат прэтэнцыёзнага, многія яго сцвярджэнні і заўвагі былі непрадуманыя, невывераныя, а часам і проста памылковыя, што выклікала зразумелае недаўменне і абурэнне ўдзельнікаў пленума.

Пытанням прапаганды беларускай літаратуры прысвяціў сваё выступленне М. Скрыпка. Ён адзначыў, што ў гэтай справе разам з дасягненнямі маецца шмат сур'ёзных недахопаў. У сувязі з гэтым прамоўца крытыкаваў работу Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР.

Аб высокай чалавечай і грамадзянскай адказнасці, аб вялікай патрабавальнасці да сябе тых пісьменнікаў, якія пішуць альбо спрабуюць пісаць пра Уладзіміра Ільіча Леніна, гаварыў на Пленуме Піліп Пестрак. Прамоўца падкрэслівае:

— Леніна любіць увесь свет, кожны працоўны чалавек, дзе б ён ні жыў, якога колеру скуру ні меў бы. І задача пісьменніка не сцвярджаць гэтую любоў, не крычаць аб ёй, а паказваць, раскрываць вытокі гэтай усенароднай любві і пашаны, паказваць тое, што зроблена Леніным, зроблена намі па яго запаветах. Ленін — у кожным нашым дні, у кожным нашым здзяйсненні. І гэта не абстракцыя, не прыгожае слоўца. Гэта — рэальнасць, бо Ленін — самы мудры, самы чалавечны і самы просты з усіх людзей — вечна жывы!

— У святле даклада Івана Паўлавіча Мележа і ў выступленнях многіх таварышаў, — гаворыць Язэп Семяжон, — вельмі ярка ўстае вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна і яго роля ў развіцці нашай нацыянальнай літаратуры. Без ленінскай нацыянальнай палітыкі не было б тых дасягненняў, пра якія мы сёння гаворым. Беларуская літаратура ніколі не замыкалася ў вузкіх нацыянальных рамках. Яна адразу заняла шырокія інтэрнацыянальныя сувязі не толькі з літаратурамі суседніх народаў, але і з усёй сусветнай літаратурай. І як раней, так і сёння гэта ўзбагачала і ўзбагачае яе новымі ідэямі і вобразамі, пашырала і пашырае яе геаграфічныя рамкі і самую яе тэматыку і ў той жа час не сцірала і не сцірае яе самабытны характар.

Прамоўца гаворыць аб тым, што сёння беларуская літаратура вядома ў краінах Старога і Новага свету, у краінах Захаду і Усходу. Я. Семяжон нагадвае, што толькі за кастрычнік і палову лістапада гэтага года ў беларускіх перыядычных выданнях было надрукавана нямала вершаў і апавяданняў пісьменнікаў Расійскай Федэрацыі, падборка вершаў сучасных польскіх паэтаў, пераклад паэмы старэйшага нямецкага паэта-камуніста Макса Цымерынга «Крокам Кастрычніка», вершы паэтаў ГДР, новыя пераклады з Шылера і Гётэ, кніга старэйшага паэта Латвіі Яна Судрабкална, выбранае класіка армянскай літаратуры Аванеса Туманяна, цыкл апавяданняў і навел сучасных венгерскіх пісьменнікаў і многія творы другіх іншамоўных аўтараў. У сваю чаргу, гаворыць прамоўца, многія творы беларускай літаратуры выйшлі на мовах многіх народаў нашай краіны і краін свету — новае выданне на рускай мове рамана-дылогіі І. Мележа, кніга вершаў на рускай мове Х. Мальцінскага, праспект першага тома антологіі беларускага апавядання на нямецкай мове ў выдавецтве «Фольк унд форшрыт» (ГДР), вялікая падборка вершаў М. Танка, П. Панчанкі, Р. Барадуліна, В. Вярбы, Д. Бічэль-Загнетавай у польскім штотыднёвіку «Жыце літэрацке», цыкл апавяданняў М. Лынькова, І. Шамякіна, Я. Брыля ў японскім часопісе «Савета Бунчаку» №№ 6—7 за гэты год.

— У нашы дні, — працягвае Я. Семяжон, — бадай што ці ёсць патрэба даказваць і растлумачваць значэнне і важнасць мастацкага перакладу. Сама атмасфера нашай краіны, што з'яднала адным лёсам 15 рэспублік і мноства разнамоўных народаў, энергічна стымулюе перакладчыцкую справу і нібы абавязвае кожнага пісьменніка аддаваць ёй хоць частку сваіх сіл і часу. Большасць нашых работнікаў літаратуры так і робіць. На гэтай ніве найбольшыя здабыткі дасягнуты нашымі старэйшымі таварышамі, народнымі паэтамі А. Куляшовым — аўтарам бліскучых перакладаў кнігі лірыкі Лермантава, паэмы Катлярэўскага «Энеіда», «Гайаваты» Лангфэла і М. Танкам, які адзін падняў больш за ўсіх нас і класічнай і сучаснай польскай паэзіі. А праца такіх умелых і спрактыкаваных майстроў, як А. Вялюгін, Я. Брыль, Ю. Гаўрук, М. Лужанін, А. Зарыцкі, Р. Барадулін, М. Хведаровіч, А. Звонак, Э. Агняцвет, Я. Бяганская! Пералік гэты можна было б прадоўжыць дзесяткамі новых імёнаў.

Адзначыўшы несумненныя поспехі атрада беларускіх перакладчыкаў, шырокую вядомасць нашай літаратуры ў краінах свету, прамоўца спыняецца на недахопах, якія яшчэ ёсць, на яго погляд, у справе ўзаемнага абмену духоўнымі каштоўнасцямі нашага народа з народамі свету. Ён, у прыватнасці, гаварыў аб тым, што да гэтага часу ў планах выдавецтва «Беларусь» перакладной кнізе адводзіцца надзвычай мала месца, што наспела вострая патрэба ў беларуска-іншамоўных слоўніках і падручніках граматыкі беларускай мовы ў разліку на замежнага чытача, што нашым вучоным-моваведам трэба займацца распрацоўкай такіх праблем і пытанняў, як, напрыклад, параўнаўчая беларуская і англійская фразеалогія, беларуска-англійскі ці беларуска-нямецкі слоўнікі, што трэба актывізаваць і пашырыць падрыхтоўку нацыянальных перакладчыцкіх кадраў, што ўвогуле пытанню аб пашырэнні і практычным умацаванні ўзаемаабмену культур трэба ўдзяляць значна больш увагі.

Аб жыватворным уплыве ленінскіх ідэй на станаўленне і развіццё беларускай савецкай літаратуры гаварыў на пленуме Авяр'ян Дзеружынскі. Сёння, гаворыць прамоўца, калі мы азіраемся назад, на пройдзены намі шлях, калі падсумоўваем вынікі нашай працы, асабліва відочна, якіх велізарных поспехаў дасягнула беларускае мастацкае слова за апошняе паўстагоддзе. Возьмем нашу прозу. Дастаткова назваць толькі імёны Івана Мележа, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Івана Навуменкі, Янкі Скрыгана, Івана Пташнікава, каб пераканацца, як далёка сягнула наша проза. Лепшыя нашы раманы і аповесці карыстаюцца вялікай папулярнасцю не толькі ў нашай рэспубліцы, у іншых рэспубліках нашай краіны, але і за яе межамі.

— Пэўнымі поспехамі, — працягвае прамоўца, — можа пахваліцца не толькі проза. Выдатныя здабыткі ёсць у галіне паэзіі, гумару і сатыры, дзіцячай літаратуры. Але мне здаецца, што, нягледзячы на перадсвяточны характар нашага пленума, мы ўсё ж больш павінны гаварыць аб тым, што яшчэ не зроблена, засяроджваць сваю ўвагу на недахопах у нашай рабоце. Думаецца, што гэта будзе па-партыйнаму, па-ленінску. Таму дазвольце мне выказаць некалькі крытычных заўваг.

Працягваючы гэтую сваю думку, А. Дзеружынскі гаворыць аб тым, што, як слушна і своечасова гаварыў на з'ездзе калгаснікаў Беларусі першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў, у апошнія гады беларуская літаратура пачала страчваць сваё званне «летапісу калгаснай вёскі», што велізарныя пераўтварэнні, якія адбываюцца на нашых вачах у эканоміцы калгасаў, у жыцці і побыце калгаснікаў, застаюцца па-за ўвагай пісьменнікаў; аб тым, што беларускія пісьменнікі надзвычай рэдка звяртаюцца да мінулага нашага народа, і гэта ў той час, калі кнігі пра мінулае вельмі патрэбны нашай моладзі — каб бачыць, кім мы былі і кім сталі; а таксама аб тым, што трэба актывізаваць удзел беларускіх паэтаў у стварэнні сучаснага песеннага рэпертуару, якога патрабуюць шматлікія прафесіянальныя і самадзейныя калектывы і выканаўцы.

З вялікай увагай слухалі ўдзельнікі пленума выступленне загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ С. В. Марцэлева.

Праблемы, якія абмяркоўваюцца на сённяшнім пленуме, гаворыць прамоўца, надзвычай актуальныя і маюць для нашай літаратуры вялікае значэнне. Той факт, што стан сучаснай беларускай літаратуры разглядаецца ва ўзаемасувязі з асноўнымі марксісцка-ленінскімі метадалагічнымі прынцыпамі савецкай літаратуры, вельмі важны сам па сабе. Абмеркаванне на пленуме яшчэ раз падкрэслівае правільнасць і жыццёвасць ленінскага вучэння аб літаратуры, акцэнтуе ўвагу пісьменнікаў на тое, каб яны ў сваёй творчасці сцвярджалі ленінскія прынцыпы партыйнасці і народнасці літаратуры.

Перш за ўсё трэба адзначыць, працягвае С. Марцэлеў, што падрыхтоўка да ленінскага юбілею з'яўляецца сёння галоўным не толькі ў дзейнасці пісьменніцкай арганізацыі, але і ўсяго атрада творчай інтэлігенцыі рэспублікі, усяго нашага народа. У гонар гэтай знамянальнай даты зараз шырока ідзе сацыялістычнае спаборніцтва на прамысловых прадпрыемствах, калгасах і саўгасах. Працоўныя горада і вёскі атрымліваюць адну працоўную перамогу за другой. Сур'ёзная і плённая работа вядзецца ў творчых саюзах, а таксама ва ўстановах мастацтва рэспублікі. Што датычыць нашай пісьменніцкай арганізацыі, то бясспрэчным з'яўляецца той факт, што нашы літаратары вельмі адказна і патрабавальна адносяцца да сваёй творчасці, імкнуцца як мага лепш адзначыць 100-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча.

Адметнай рысай многіх нашых пісьменнікаў з'яўляецца тое, што яны глыбока разумеюць сучаснасць, па-партыйнаму ставяцца да сацыяльнага і духоўнага багацця, якое нясе чалавеку сацыялістычнае грамадства. Многія мастацкія творы з'яўляюцца добрым сведчаннем таго, што ленінскія прынцыпы партыйнасці і народнасці мастацтва — надзейная зброя пісьменніка, якая дае яму неабмежаваныя магчымасці для мастацкага адлюстравання фактаў і з'яў жыцця.

Аднак, станоўча ацэньваючы працэс развіцця беларускай савецкай літаратуры і яе сённяшні стан, гаворыць С. Марцэлеў, мы не павінны закрываць вочы на недахопы. А яны, на жаль, ёсць. Ёсць у асобных творах блытаныя тэндэнцыі, адсутнічаюць часам дакладныя сацыяльна-класавыя ацэнкі грамадскіх з'яў, падчас ставіцца пад сумненне эстэтычная каштоўнасць гераічнага характару ў літаратуры. Іншым разам захвальваюцца і нават выстаўляюцца ў якасці ўзору творы, якія з'яўляюцца, кажучы словамі Луначарскага, нічым іншым, як мастацкім пратаколам, мастацкай фатаграфіяй задняга двара нашай рэвалюцыі. Ёсць і проста слабыя, нецікавыя творы. Асобным нашым пісьменнікам уласціва схільнасць у некаторых сваіх творах абмяжоўваць сябе ў мастацкім даследаванні і адлюстраванні вельмі важных з'яў, усёй атмасферы нашага жыцця як вялізнага і складанага працэсу толькі паказам паасобных граней гэтага жыцця. Адсутнасць шырокага сацыяльнага і гістарычнага фону стварае часам уражанне, што пісьменнік сам абрывае сувязі, якія злучаюць яго з гістарычным вопытам народа і асабліва з перспектывай на будучае. Адсюль і пэўная статычнасць, замкнутасць, ізаляванасць ствараемых пісьменнікам малюнкаў. Што ж датычыцца твораў пра вёску, дык, зазначае прамоўца, іншы раз пры чытанні такіх твораў ствараецца ўражанне, быццам пісьменнік, паказваючы жыццё сучаснай вёскі, не столькі глядзіць наперад, колькі азіраецца назад, заваражаны патрыярхальнымі рысамі мінулага духоўнага і бытавога ўкладу.

У сувязі з усім гэтым, падкрэслівае С. Марцэлеў, хацелася б выказаць пажаданне, каб галоўным прадметам абмеркавання на пленумах, пасяджэннях прэзідыўма праўлення, на творчых секцыях Саюза пісьменнікаў быў змест твораў, іх ідэйна-мастацкая вартасць.

Бясспрэчна, працягвае прамоўца, што наша творчая інтэлігенцыя зараз дае для народа ў многа разоў больш твораў, чым яна давала калі-небудзь раней. І па сваёй цікавасці, па ідэйна мастацкіх якасцях наша літаратура таксама вырасла. І усё-такі наш народ адчувае востры недахоп, а часам, калі можна так сказаць, і голад на новыя творы. Прычыны такога становішча можна растлумачыць. Па-першае, сур'ёзна вырасла культура народа. Па-другое, чалавек зараз жыве ў больш інтэнсіўным рытме, які патрабуе пастаяннага прытоку свежых паведамленняў, думак, пачуццяў. Усё гэта, разам з шэрагам іншых прычын, вымагае ад творчай інтэлігенцыі большай спорнасці ў працы. На жаль, у нашых творчых арганізацыях, у тым ліку і ў Саюзе пісьменнікаў, ёсць нямала членаў, якія не толькі не растуць творча, але ўвогуле доўгі час нічога аб сабе не гавораць, нічым сябе не праяўляюць.

С. Марцэлеў спыняецца таксама на праблемах нашай літаратурнай крытыкі. Адзначаючы тое станоўчае, што зроблена і робіцца беларускім літаратуразнаўствам і крытыкай, гаворыць ён, трэба ўсё ж сказаць, што пакуль што крытыка не робіць дастатковага ўплыву на творчы рост пісьменніка, на фарміраванне эстэтычных поглядаў савецкіх людзей. І справа тут, відаць, у тым, што нашай літаратурнай крытыцы не хапае прынцыповасці і аб'ектыўнасці ў ацэнцы з'яў літаратуры, што яна занадта, часам, прымірэнчая ў адносінах да твораў, якія маюць сур'ёзныя ідэйна-мастацкія пралікі, што асобныя крытыкі вядуць гаворку аб літаратуры не з марксісцка-ленінскіх пазіцый, а з пазіцый абстрактна-гуманістычных. А гэта прыводзіць да парушэння прынцыпу гістарызма, да ігнаравання класавага зместу мастацтва, да прымірэнчых пазіцый у ідэалагічнай барацьбе нашага часу.

Літаратура і мастацтва з'яўляюцца адной са сфер актыўнай ідэалагічнай барацьбы. І задача кожнага пісьменніка як актыўнага ідэалагічнага байца, падкрэслівае прамоўца, памнажаць свой уклад у барацьбу з буржуазнай ідэалогіяй, у выхаванне камуністычнай свядомасці нашых людзей. Важным сродкам барацьбы супраць буржуазнай ідэалогіі з'яўляецца пазітыўная распрацоўка нашых уласных праблем, паказ дасягненняў і пераваг сацыялістычнага ладу, сацыялістычнага ўкладу жыцця.

Партыя, гаворыць у заключэнне С. Марцэлеў, заўсёды зацікаўлена і чула ставілася і ставіцца да творчых пошукаў мастака, які імкнецца з пазіцый партыйнасці і народнасці перадаць усю складанасць, вастрыню праблем сучаснасці альбо гісторыі, заўсёды падтрымлівала і падтрымлівае мастацтва і літаратуру, якія сцвярджаюць веру ў нашы ідэалы. Ленінская непрымірымасць да любых, вольных ці міжвольных, адхіленняў ад правільных ідэйных тэндэнцый у мастацтве, ленінскія крытэрыі партыйнасці і народнасці літаратуры павінны быць сёння на ўзбраенні кожнага работніка ідэалагічнага фронту, кожнага дзеяча мастацтва. Не псеўданаватарскія крыўлянні, не эстэтычная абмежаванасць, не беззмястоўная дэкламацыя, а глыбокае вывучэнне таго агульнага ўздыму ва ўсіх галінах матэрыяльнага і духоўнага жыцця нашага грамадства павінна прыцягваць сёння пісьменніцкую ўвагу. Вельмі важна, каб літаратура на ўвесь голас, на высокім прафесіянальным узроўні раскрывала вялікую праўду жыцця першай у свеце краіны сацыялізма, раскрывала веліч і прыгажосць здзяйсненняў савецкіх людзей. Уладзімір Ільіч Ленін не аднойчы падкрэсліваў, што нам не патрэбны лісліўцы. Трэба, каб нам гаварылі праўду. А што ёсць прыгажэйшае і больш велічнае за праўду нашага савецкага жыцця! Шчырае і паслядоўнае служэнне гэтай праўдзе, актыўнае змаганне за яе — менавіта гэта акрыляе талент пісьменніка, вызначае ўнутраны пафас, накіраванасць і рухаючую сілу яго індывідуальнай творчасці. Сённяшні пленум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі яшчэ раз паказаў, што нашы літаратары добра разумеюць усю адказнасць і веліч задач, якія стаяць перад імі, што яны высока нясуць сцяг камуністычнай партыйнасці, актыўна змагаюцца за перамогу светлых ленінскіх ідэалаў.

Па абмеркаваным пытанні пленум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР прыняў разгорнутую рэзалюцыю, у якой, у прыватнасці, гаворыцца: «Пад сцягам ленінскіх ідэй беларуская літаратура за паўстагоддзе савецкай улады дабілася поспехаў і шырокага прызнання ў нашай краіне і за яе межамі. Зараз наша мастацкая проза, паэзія, драматургія, публіцыстыка папаўняюцца новымі творамі, у якіх пісьменнікі адлюстроўваюць імкненні, думы, працоўныя подзвігі савецкіх людзей — будаўнікоў камуністычнага грамадства. Ленінскія прынцыпы партыйнасці і народнасці літаратуры сталі галоўнымі прынцыпамі ў творчасці ўсіх нашых пісьменнікаў, а метад сацыялістычнага рэалізму — іх творчым метадам.

Аднак мы добра памятаем запавет вялікага Леніна, што нельга супакойвацца на дасягнутым, што юбілеі абавязваюць таксама прыняць пад увагу яшчэ не вырашаныя задачы з тым, каб іх вырашыць. Наша літаратура ва ўсіх жанрах адстае яшчэ ад жыцця, ад праблем, якія яно ўздымае. Яшчэ з'яўляюцца творы неглыбокія, якім не хапае жыццёвай праўды, філасофскай глыбіні, мастацкага майстэрства. Яшчэ нямала выходзіць кніг, якія не хвалююць чытачоў, не ўзбагачаюць іх духоўна і эмацыянальна.

Пленум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР заклікае пісьменнікаў да яшчэ большай творчай актыўнасці, да напісання новых мастацкіх твораў, якія ўзбагацяць беларускую Ленініяну, да напісання твораў, прысвечаных паказу тых гістарычных змен, якія адбыліся ў жыцці народа ў барацьбе за перамогу камунізма ў нашай краіне, твораў аб нашым сучасніку — радавым змагары, за светлую будучыню чалавецтва.

Пленум прызнае слушнасць дакору, які быў выказаны на рэспубліканскім з'ездзе калгаснікаў аб адставанні літаратуры ад жыцця сельскіх працаўнікоў і даручае прэзідыуму праўлення СП БССР падрыхтаваць і правесці ў бліжэйшы час творчую размову на тэму: «Праблемы сённяшняй вёскі і беларуская літаратура».

Беларускія пісьменнікі запэўніваюць ЦК КПСС, Камуністычную партыю Беларусі і яе Цэнтральны Камітэт, што зробяць усё, каб быць вартымі высокага даверу, якое аказвае партыя і народ нашай літаратуры, будуць высока несці сцяг самай перадавой у свеце савецкай літаратуры».

ПЕРШАПРАХОДЦА

Да 70-годдзя з дня нараджэння Міхася Клімковіча

ГАВОРАЧЫ пра зробленае Міхасём Клімковічам як драматургам гістарычнага жанру, Пятро Глебка падкрэсліў: «Ён першы, па сутнасці, палажыў у беларускай літаратуры пачатак гэтаму жанру ў такіх сваіх лепшых творах, як «Георгій Скарына» і «Кацярына Жарнасек». Ён ажывіў перад намі нашу старажытнасць, узняў падзеі дзён даўно мінулых і прымусіў іх, не фальсіфікуючы гісторыі, служыць нашай сучаснасці. У гэтым яго заслуга».

Сапраўды, ужо адна толькі трылогія «Георгій Скарына», апошнюю частку якой аўтар не паспеў адрэдагаваць і ўбачыць апублікаванай, абумоўлівае трывалае месца гэтага пісьменніка ў беларускай савецкай літаратуры. Гэты вялікі твор, які пакуль што застаецца «п'есай для чытання», быў напісаны Міхасём Клімковічам з мэтай па-мастацку асэнсаваць багатыя і яркія старонкі мінулага беларускага народа, паказаць праз жывыя вобразы ўсю складанасць гісторыі беларусаў XVI стагоддзя, народжаныя гэтай гісторыяй велічныя характары, прайсці першапраходцам праз неспазнаную яшчэ літаратурай глебу гістарычна-дакументальных матэрыялаў, каб яны загаварылі моваю вобразаў і моваю жывых характараў. Пісьменнік, ператвараючыся ў гісторыка, не паўтарае яго. Скарына ў Міхася Клімковіча абмаляваны рэльефна, ва ўсёй разнастайнасці яго натуры, патрыёт, чалавекалюбца, мысліцель.

Пісьменніку ўдалося здзейсніць сваю задуму, у значнай меры дзякуючы вопыту, набытаму ў часе працы над драматычнай паэмай «Кацярына Жарнасек», драматычнага абразка «На віленскім шляху», лібрэта оперы «Кастусь Каліноўскі», п'есай «Адплата». Жывучы ў свеце вобразаў больш далёкага XVI стагоддзя і менш далёкага дзевятнаццатага, Міхась Клімковіч звяртаўся ў сваёй творчасці і да сучаснай яму эпохі — да пераломных момантаў гісторыі Айчыны. Ім напісана апублікаваная пасля смерці драматычная паэма «Уся ўлада Саветам!» Твор, прысвечаны Вялікаму Кастрычніку на Беларусі, грунтуецца на гістарычных фактах. У ім увасоблены вобразы Аляксандра Фёдаравіча Мяснікова, Петруся Пралыгіна, які ў рашучы момант устанаўлення Савецкай улады ў Мінску ўвёў у горад пяхотныя часці і бронецягнік на дапамогу бальшавікам. У творы добра перададзена атмасфера векапомных дзён Кастрычніка на Беларусі, настроі народных мас, якія ішлі за бальшавікамі.

Дзякуючы творчасці Міхася Клімковіча, мы больш рэльефна сталі ўяўляць сабе многія істотныя моманты слаўнага гераічнага мінулага нашага народа.

І ўсё ж не адным толькі талентам гістарычнага драматурга забяспечана яго месца ў нашай літаратуры. Па сутнасці, толькі пасля смерці Міхася Клімковіча высветлілася, што ён паэт са сваім голасам, хай сабе не вельмі «гучным», але задушэўным. Сабраныя ў двухтомніку выбраных твораў вершы розных гадоў адкрываюць перад намі ўнутраны свет чалавека, улюбёнага ў родную прыроду, у працоўнага чалавека. У гэтых вершах — матывы лірычныя і матывы адкрыта публіцыстычныя. Тут побач з байкай — распрацоўка народных матываў, побач з песняй-заклікам — вершы аб каханні.

Як паэту, Міхасю Клімковічу выпала шчасце стаць аўтарам Дзяржаўнага гімна БССР.

Шмат працаваў ён і як крытык і літаратуразнаўца.

Многія работы Міхася Клімковіча ўбачылі свет пасля яго смерці. Пры жыцці ён не спяшаўся выпусціць рукапіс з рук. Дастаткова пабачыць яго рукапісы, спярэшчаныя папраўкамі, шматлікія варыянты сцэн у п'есах, вершаў, артыкулаў, каб зразумець, што працаваў Міхась Клімковіч, настойліва дабіваючыся найлепшага гучання слова, найдакладнейшай перадачы думкі, прыслухоўваючыся да крытычных заўваг калег, прыслухоўваючыся да ўласнага сэрца.

Хто ведае, можа быць, Міхась Клімковіч многае перапісаў бы яшчэ і яшчэ, ды і ўвогуле напісаў бы больш, калі б не яго няўрымслівая натура пісьменніка, які жадаў бачыць родную літаратуру багатай на розныя і добрыя таленты. Ён належаў да ліку тых пісьменікаў, якія вельмі ахвотна дапамагаюць творчай моладзі. Колькі добразычлівых, па-бацькоўску патрабавальных пісем атрымалі ад яго пачаткоўцы ў літаратуры! І няхай далёка не ўсе з іх сталі літаратарамі — усё адно яны шмат чаму навучыліся ў пісьменніка, а перш за ўсё — любові да роднай літаратуры, патрабавальнасці да сябе ў працы. Ён пісаў гэтыя пісьмы пачаткоўцам па начах, бо ўдзень быў заняты рэдактарскай работай у выдавецтве. Ён пісаў гэтыя пісьмы, дзелячы хуткаплынны час паміж імі і сваімі ўласнымі рукапісамі, якія патрабавалі ўдасканалення, шліфоўкі. Да таго ж нельга не сказаць і пра тое, колькі часу забірала грамадская работа.

Міхасём Клімковічам была сабрана унікальная бібліятэка — своеасаблівая «Беларусіяна». Кнігі, спярэшчаныя ягонымі паметкамі, таксама патрабавалі часу. І ён чытаў патрэбнае для наступнай работы, а побач — чакалі чаргі кнігі калег па пяру... А яшчэ чакалі сваёй чаргі пераклады на родную мову твораў пісьменнікаў братніх народаў... А яшчэ чакалі чаргі фальклорныя запісы, якія затым апрацоўваліся Клімковічам і, пакладзеныя на музыку лепшымі беларускімі кампазітарамі, вярталіся ў народ...

Міхась Клімковіч адукаваў сябе сам. І тое, што паспеў зрабіць, зрабіў дзякуючы творчай волі, здольнасці працаваць многа, не шкадаваць сябе дзеля літаратурнай работы, нават будучы цяжка хворым...

Лепшым творам Міхася Клімковіча суджана доўгае жыццё. Я перакананы, што прыйдзе рэжысёр, які «прачытае» «Георгія Скарыну» на сцэне, і гэты твор перастане быць толькі «п'есай для чытання».

Яго сціплая, самаадданая праца ў літаратуры пакінула след прыкметны, а галоўнае — трывалы. Аб гэтым і прыгадваем з выпадку сямідзесятай гадавіны з дня яго нараджэння.

Уладзімір БОЙКА.

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

СЕЗОН 1969-70 гг

ЧАКАЕМ РАДАСНЫХ СУСТРЭЧ

Пачаўся фестываль камернай музыкі ў Беларусі.

ЧАРОЎНАЯ музыка Чайкоўскага, трывожная і мужная — Бетховена, паэтычная і ўсхваляваная — Моцарта, фантастычная — Дэбюсі, суровая і палымяная — Шастаковіча хутка запоўніць канцэртныя залы рэспублікі.

22 лістапада, у суботу, у Мінску пачаліся першыя канцэрты фестывалю камернай музыкі, у якім прымуць удзел лаўрэаты ўсесаюзных і міжнародных конкурсаў. Гэта вялікае свята аматараў камернай музыкі, яе тонкага мастацтва. А тое, што ў нас, у рэспубліцы шмат такіх аматараў, гаворыць мінулы фестываль, кожны канцэрт якога збіраў вялікія аўдыторыі.

Беларуская дзяржаўная філармонія прадаставіла сцэну добра вядомым выканаўцам і таленавітай моладзі.

У фестывалі прымаюць удзел таленавітыя віртуозы ігры на народных інструментах, якія працягваюць выдатныя традыцыі славутага Васілія Андрэева. Сярод іх— Павел Нечыпарэнка. У яго выкананні прагучаць творы Моцарта, Дворжака, Сен-Санса, Васіленкі, Андрэева.

Імя Юрыя Казакова таксама добра вядома аматарам класічнай і народнай музыкі. «Баяніст — унікум тэхнічнага майстэрства», — так пісалі аб яго выступленні ў Нарвегіі. Беларускія слухачы ўжо не раз пераконваліся ў гэтым і з нецярпеннем чакаюць новых сустрэч.

У фестывалі прыме ўдзел малады выканаўца Віктар Траццякоў, якога палюбілі ўжо мінчане і аб якім яшчэ тры гады назад пісала міланская газета «Іль Джорыо»: «Новае свяціла з'явілася на небе рускай скрыпічнай ігры, якое і так ужо багатае выдатнымі зоркамі». У праграме Траццякова — Моцарт, Брамс, Равель, Бабаджанян.

Прыхільнікі царыцы музыкі — скрыпкі пазнаёмяцца з Філіпам Хіршхорнам, які заваяваў у 1965 годзе на міжнародным конкурсе імя Паганіні другую прэмію, а праз год, у Бруселі — прэмію імя каралевы Лізаветы. Рэпертуар гэтага таленавітага музыканта вельмі разнастайны. Ён парадуе і класікай, і творамі сучасных кампазітараў.

Выступіць у Мінску віяланчэліст Ігар Гаўрыш, лаўрэат міжнародных і ўсесаюзных конкурсаў, выканаўца, для якога цудоўная тэхніка не з'яўляецца самамэтай, а дазваляе цалкам данесці сэнс твора, увесці слухача ў глыбіні музыкі.

Упершыню перад беларускімі слухачамі выступяць два маладыя, але ўжо добра вядомыя ў музычных колах піяністы — Дзмітрый Аляксееў, музыкант з арыгінальным творчым почыркам, абаяльнасцю, якая адразу вабіць да яго публіку, і Мікалай Пятроў, які валодае вогнена-палымянай тэхнікай.

Цікавымі абяцаюць быць выступленні камерных аркестраў і струнных ансамбляў. Далёка за межамі Савецкага Саюза славіцца Дзяржаўны квартэт імя Танеева, які вызначаецца «вытанчанай камернасцю», разнастайнасцю гукавой палітры. Шматлікія водгукі прэсы сведчаць аб высокім прызнанні квартэта.

Не менш цікавы струнны квартэт імя М. В. Лысенкі. Па-ўкраінску заўзята, прывольна, тэмпераментна, і разам з тым вельмі лірычна гучаць у яго выкананні творы Штагарэнкі, Кірэйкі, Кабалеўскага, Пракоф'ева. За час існавання струнны квартэт даў звыш дзвюх тысяч канцэртаў.

Ужо трынаццаты год паспяхова выступае Маскоўскі камерны аркестр пад кіраўніцтвам дырыжора Баршая. У рэпертуары ансамбля— класічныя творы Баха, Карэлі, Вівальдзі, Гайдна, а побач з імі — творы выдатных кампазітараў XX стагоддзя — Бартока, Марціну, Брытэна і раду савецкіх кампазітараў. Ансамбль пабываў на гастролях у Англіі, Аўстрыі, Бельгіі, ЗША, Польшчы, Галандыі, Францыі, ГДР, ФРГ.

Самы малады калектыў на гэтым фестывалі — камерны аркестр Беларускай філармоніі. Мастацкі кіраўнік — А. Янчанка, таленавіты кампазітар, арганіст і піяніст.

Грузінскае трыо ў складзе Мдзівані, Ісакадзе і Габарашвілі выканае творы Бакрадзе, Шаверзашвілі, Насідзе, Шуберта, Мендэльсона.

Колькі разоў выступала ў Мінску М. Біешу, якая выконвала галоўныя партыі ў «Чыо Чыо-сан» і «Аідзе», столькі разоў зала опернага тэатра была перапоўнена. Народная артыстка Малдаўскай ССР М. Біешу — удзельніца фестывалю камернай музыкі ў Беларусі.

Засталося толькі пажадаць удзельнікам фестывалю поспеху, а аматарам музыкі — радасных сустрэч з імі.

Н. АНЧЫКАВА.

Н. Х. КАРЖЫЦКАЯ

Пасля цяжкай і працяглай хваробы на 62-м годзе жыцця памерла старэйшы работнік кінематаграфіі, персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння, член КПСС з 1928 года Надзея Харытонаўна Каржыцкая.

Н. Х. Каржыцкая нарадзілася ў вёсцы Арэхі Аршанскага павета Магілёўскай губерні ў беднай сялянскай сям'і. Працоўную дзейнасць яна пачала ў 1928 годзе з арганізатара ў жаночым аддзеле Копыскага райкома партыі. У 1930 годзе, у перыяд разгорнутай калектывізацыі Н. Х. Каржыцкая прызначаецца інструктарам райкалгассаюза ў Талачыне.

У наступныя гады яна працуе інфарматарам ЦК КП Беларусі, сакратаром прафсаюза Саюза работнікаў мастацтваў, культінспектарам Цэнтральнага Савета прафсаюзаў БССР.

У 1937 годзе партыя накіроўвае Н. Х. Каржыцкую ў кінематаграфію, дзе яна і працуе да выхаду на пенсію.

З 1937 года і ў перыяд Айчыннай вайны Надзея Харытонаўна была дырэктарам Белдзяржкінахронікі, кінахронікі Татарскай АССР. У цяжкі для краіны час яна аддае шмат сіл для стварэння хвалюючых кінастужак аб подзвігу савецкага народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля вызвалення Беларусі ад гітлераўцаў Надзея Харытонаўна пераязджае ў Мінск і прызначаецца кіраўніком Беларускай рэспубліканскай канторы кінапракату. З 1957 па 1959 год яна працавала кіраўніком Мінскай аб'яднанай гарадской і абласной канторы кінапракату. З 1959 года Н. Х. Каржыцкая — персанальны пенсіянер.

Партыя і Савецкі ўрад высока ацанілі заслугі Н. Х. Каржыцкай перад народам. Яна была ўзнагароджана двума ардэнамі «Знак Пашаны» і медалем «За працоўную доблесць у Вялікай Айчыннай вайне».

Н. Х. Каржыцкая была вернай дачкою Камуністычнай партыі і савецкага народа, працалюбівым і нястомным работнікам, актыўным грамадскім дзеячом, чулым, сціплым і сардэчным таварышам.

Светлая памяць аб Н. Х. Каржыцкай захаваецца ў нашых сэрцах.

Група таварышаў.

Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі смуткуе з поваду смерці старэйшага работніка кінематаграфіі, былога кіраўніка Мінскай абласной і гарадской канторы кінапракату, персанальнага пенсіянера, члена КПСС з 1928 года Надзеі Харытонаўны Каржыцкай і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыцы.

ЗНОЎ МОЛАДА СВЕЦЯЦЦА ВОЧЫ

Пра Бершты ведаюць не толькі на Гродзеншчыне, а і ў Мінску, Маскве, Ленінградзе, і нават далёка за акіянам, у Амерыцы. Славіцца вёска сваім таленавітым майстрам, чые залатыя рукі вось ужо колькі гадоў робяць інструменты, гукі якіх прыносяць людзям радасць. Дом, дзе жыве гэты майстар, ведаюць усе жыхары Берштаў —і дарослыя, і малыя.

— Уладзіміра Іосіфавіча? Як жа, ведаем,—і з нейкім асаблівым гонарам пачынаюць расказ пра свайго аднавяскоўца. І пакуль давядуць да хаты, дзе жыве Уладзімір Іосіфавіч Шышко, ужо шмат чаго даведаешся пра гэтага чалавека, яго незвычайны лёс. А калі бліжэй пазнаёмішся з гасцінным гаспадаром, пагутарыш з ім, паслухаеш, як ён іграе на скрыпках, што робіць сам, здаецца, што даўно ўжо ведаеш гэтага высокага пасівелага чалавека з такімі здзіўляюча маладымі вачыма. Разумееш, адкуль бярэцца павага да яго ў аднавяскоўцаў, іх гонар, што гэты сціплы чалавек жыве іменна ў Берштах, сярод іх.

Чатырнаццацігадовым хлапчуком застаўся Уладзік без бацькоў, пачаў сам зарабляць на кавалак хлеба. Быў падпаскам, парабкам у пана. А потым паддаўся на ўгаворы нейкага вяртлявага вярбоўшчыка і паехаў у пошуках лепшай долі за акіян.

Паехаў і лішні раз упэўніўся, што бядняк—усюды бядняк. Лепшая работа — амерыканцам. Такіх, як ён: беларусаў, украінцаў, італьянцаў і іншых, што прыехалі сюды на заработкі, — нават і за людзей не лічылі. І цяпер яшчэ здараецца, што ён прачынаецца сярод ночы ў халодным поце. Убачыцца яму ў цяжкім сне, што быццам зноў сарваўся ён з параходнага трапа і ляціць з цяжкім цюкам у бездань мора... Што памірае ад смагі на спякотнай плантацыі... Што навісла над ім дубінка паліцэйскага — гоніць яго са скамейкі ў парку, дзе прытуліўся ён галодны, знясілены...

Аказалася, што здабываць долары не лягчэй, чым злотыя.

Аднойчы, калі Уладзімір вяртаўся з біржы, не атрымаўшы работу, галодны, замёрзлы, ён раптам пачуў гукі скрыпкі. Нібы зачараваны спыніўся пад вокнамі дома. А музыка несла юнака ў тыя далёкія, родныя сэрцу мясціны, дзе прайшло яго дзяцінства, дзе зліліся ў мілагучным шолаху бярозкі ды сосны, дзе ён слухаў вандроўных старцаў-жабракоў і змайстраваў быў сваю першую няўклюдную скрыпку. І зноў вярнулася да яго далёкая дзіцячая мара— зрабіць скрыпку. Сапраўдную...

Каля двух гадоў рабіў Уладзімір інструмент. Нарэшце настаў дзень, калі крануўся смычок галасістых струн. Суседзі, сябры—такія ж небаракі, як і ён, шчыра здзівіліся: адкуль у яго гэта майстэрства? Часта збіраліся да яго ў цесны пакойчык, каб паслухаць родныя напевы, успомніць радзіму.

Але не доўга цешыўся Уладзімір. Як ні шкада было, давялося скрыпку, якая прынесла яму столькі радасці і надзей, прадаць: не было чаго есці.

А потым ён зрабіў яшчэ некалькі скрыпак, якія таксама набылі ў яго знаўцы-музыканты. Хаця і нялёгка было расставацца з плёнам сваёй працы, але нічога не зробіш—ён збіраў грошы, каб вярнуцца на радзіму.

Шмат дзён прайшло з таго часу, шмат разоў сустракаў ён — ужо на радзіме — і вясну, і лета. Гады пасерабрылі яго галаву. Але не прапаў запал душы. Свой талент, уменне аддаў ён роднай зямлі, той зямлі, прыгажосцю якой ніяк не можа налюбавацца пасля доўгага расстання. І цяпер на тых скрыпках, што зрабіў умелец з вёскі Бершты Шчучынскага раёна Уладзімір Іосіфавіч Шышко, іграюць майстры з Гродна, Мінска, Масквы і іншых гарадоў краіны. Сярод іх нават ёсць скрыпачы з сусветнай славай...

Інструменты майстра-самавучкі з Прынямоння неаднаразова экспанаваліся і на рэспубліканскіх, і на Усесаюзных выстаўках. Знаўцы называюць яго беларускім Страдыварыусам і заказваюць інструмент толькі ў яго.

Здаецца, можна спакойна адпачываць на старасці гадоў— яму ж ужо восьмы дзесятак. Здаецца, у такім узросце не да захапленняў. Але... Пачуў аднойчы Уладзімір Іосіфавіч па радыё выступленні рабочых, калгаснікаў, служачых — пра тое, што яны рыхтуюць у падарунак вялікаму святу беларускага народа, 50-годдзю БССР і КПБ, і сам загарэўся... Так, паднясе і ён радзіме падарунак. Незвычайны — скрыпку. Юбілейную...

Доўга і старанна падбіраў ён са сваіх загатовак драўляныя брускі. Тыя, што ўжо вылежваліся дзесяцігоддзямі, вымакалі месяцамі, сохлі без сонца і ветру. Кожны сантыметр брускоў выстукваў малаточкам, выслухваў і зноў асцярожна клаў на стол, браў іншыя, зноў выстукваў, выстукваў і слухаў, слухаў... І толькі тады, калі ўпэўніўся, што дрэва спявае, прыступіў да работы. Сапраўднай, упартай, карпатлівай, ювелірнай! Не ведаў стомы стары майстар, не даваў сабе ні дня адпачынку. Так прайшло больш за год. І вось ён — плён яго працы, часцінка яго душы. На зваротным боку, дзе звычайна ставяць фабрычны знак, акуратна напісаў «Юбілею рэспублікі. Майстар Уладзімір Іосіфавіч Шыцко».

Я ўспамінаю зараз сваю сустрэчу і гутаркі з гэтым незвычайным чалавекам і не магу не парадавацца, што пашчасціла з ім пазнаёміцца. Цудоўны расказчык, скрыпач-віртуоз, улюбёны ў мелодыі роднага краю...

Як ён граў мне, як слухаўся яго смычок-чарадзей, як звінелі пявучыя струны! Быццам гаварыла-спявала сама душа. І гарэлі свяціліся маладосцю яго вочы, і вылівалася з-пад самага сэрца вялікая ўдзячнасць чалавека сваёй зямлі, свайму народу.

Э. ЧЭЧКА.

Фота Ул. МЯЖЭВІЧА.

ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ ПАД ЗЯМЛЁЙ

На поўдні Украіны, непадалёк ад сяла Паруціна Нікалаеўскай вобласці, размешчаны руіны старажытнагрэчаскага горада Ольвіі. Кожны год археолагі робяць тут дзівосныя адкрыцці. Знаходка, аб якой я хачу расказаць, нядаўна, увойдзе ў залаты фонд сусветнай антычнай археалогіі. У канцы жніўня амаль у самым цэнтры сяла Паруціна, на краі абрыву высокага берагу Бугскага лімана былі знойдзены багатыя магілкі антычнага часу.

Такія магілы часцей за ўсё знаходзяць разрабаванымі яшчэ ў старажытнасці. Але на гэты раз археолагам пашанцавала. Усе рэчы аказаліся на месцы. Асаблівую каштоўнасць мае чырвонафігурная пеліка другой паловы чацвёртага стагоддзя новай эры, якая цудоўна захавалася. Старадаўняя ваза ўпрыгожана роспісам, сюжэты якой узяты са старажытнагрэчаскай міфалогіі. На адным баку сасуда адлюстравана славутая сцэна бітвы грэкаў з амазонкамі. Дзве ваяўніцы вядуць рукапашны бой, абараняючыся ад ворагаў шчытамі са спецыяльным выразам для назірання за праціўнікам. Бітва ў разгары, нават паваленыя на зямлю байцы працягваюць наносіць удары сваімі кароткімі мечамі. Цяжка вызначыць, на чыім баку перавага. Дынамічнасць малюнка, кароткія рэзкія штрыхі, нібы наспех нанесеныя мастаком, асабліва ярка падкрэсліваюць вастрыню і напружанасць моманту. З другога боку сасуда — спакойная сцэна: адлюстравана шэсце грамадзян антычнага полісу. Магчыма, гэта — мудрыя філосафы, якія вяртаюцца з бурнай дыскусіі, або жрацы пасля заканчэння богаслужэння, а можа проста знатныя гараджане. Цудоўная пеліка, знойдзеная ў Ольвіі, несумненна зойме дастойнае месца сярод каштоўнейшых твораў антычнага керамічнага мастацтва.

Цікавыя і іншыя рэчы, адкрытыя пры раскопках. Зусім цэлая вастрадонная амфора, невялікі кубак для віна, пакрыты чорным лакам, з характэрным для таго часу стальным бляскам. Маленькая чашачка, зробленая з шэрай гліны. У ёй аказалася крышка попелу. Хутчэй за ўсё гэта рэшткі духмяных траў, спаленых пры пахавальным абрадзе. Нарэшце, дзве медныя манеткі, пакладзеныя ў правую руку пахаванага. Па ўяўленні старажытных грэкаў; душа памёршага павінна была заплаціць перавозчыку Харону за пераправу праз бурныя воды падземнай ракі Стыкс, якая аддзяляла жывы свет ад замагільнага царства ценяў.

Анатолій БЕЛАГОРСКІ. (АДН).

Кутох калекцыянера

У СЯМ'І АДЗІНАЙ

У красавіку 1940 года Наркамат сувязі СССР выпусціў серыю паштовых знакаў, прысвечаных уз'яднанню заходніх абласцей Беларусі і Украіны ў адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве. Аўтары серыі, старэйшыя майстры савецкай малой графікі, мастакі І. Дубасаў і С. Паманскі здолелі ў пяці марках перадаць вялікую радасць вызваленага народа, любоў да арміі-вызваліцельніцы. Савецкія байцы ўвайшлі ў беларускае сяло — з букетам асенніх кветак іх сустракае дзяўчына-беларуска. На заднім плане сяляне, хаты, крытыя саломай.

Вось яшчэ адна марка. Усёй сям'ёй, з грудным дзіцем, выйшлі сустракаць вызваліцеляў. Паціскаюць рукі, падносяць кветкі.

Абедзве маркі гэтай серыі з'яўляюцца дакументальнымі. Спецыяльны фотакарэспандэнт «Праўды» В. Цёмін адлюстраваў на плёнку сцэну раздачы байцамі Чырвонай Арміі газет насельніцтву вызваленай Гродзеншчыны. Сёння гэта славутая фатаграфія стала гістарычнай рэліквіяй, яна захоўваецца ў музеях як дакумент той эпохі. Па адным з варыянтаў фатаграфіі і зроблены дзве маркі гэтай серыі, якая завяршаецца паштовым знакам, прысвечаным вызваленню Заходняй Украіны. Група ўкраінцаў у нацыянальных касцюмах з флагам сустракае танкавую калону.

У дзесятую гадавіну ўз'яднання, у 1949 годзе, была выпушчана серыя з дзвюх марак у афармленні мастакоў В. Заўялава і Е. Сокалава.

Вядомы плакат В. Карэцкага «Вызваленне», на якім паказаны баец Чырвонай Арміі ў абдымках селяніна-беларуса, з'явіўся ў «Праўдзе» 22 верасня 1939 года. Другое жыццё гэты плакат атрымаў на марцы, выпушчанай у 1968 годзе да 50-гадовага юбілею Узброеных Сіл СССР.

Толькі цяпер, праз 30 гадоў пасля памятных падзей верасня 1939 года, калекцыянеры Беларусі выявілі некаторыя цікавыя падрабязнасці работы пошты ў вызваленых раёнах. Ваенны ўраган, які пранёсся над нашай рэспублікай у 1941—1945 гадах, знішчыў многа каштоўных архіўных матэрыялаў, у тым ліку і паштовых. Таму па драбінках збіраюцца цікавыя, не выяўленыя да гэтага часу дадзеныя. Знойдзена некалькі канвертаў ад пісьмаў, якія прайшлі пошту ў той перыяд. Вось адзін з іх. Ён пагашаны каляндарным штэмпелем 23 верасня, на пяты дзень вызвалення горада Лунінца. Мяркуючы па канверце, у горадзе ўжо былі савецкія маркі, не было толькі, натуральна, савецкіх штэмпеляў гашэння. Таму паштовыя работнікі абыходзіліся старымі польскімі штэмпелямі. Такімі штэмпелямі карысталіся ў Брэсце, Пінску, Гродна, Баранавічах.

Знойдзена пакуль не вельмі многа. Таму задача беларускіх філатэлістаў выявіць як мага больш невядомых старонак гісторыі пошты нашай рэспублікі.

Л. КОЛАСАЎ.

«ГАДЫ АДПЛАТЫ»

Мемуары Маршала Савецкага Саюза А. І. Яроменкі.

КНІЖНАЯ паліца ваенна-мемуарнай літаратуры, якая належыць пяру буйных савецкіх военачальнікаў, папоўнілася цікавай працай Маршала Савецкага Саюза Андрэя Іванавіча Яроменкі — «Гады адплаты» (Выдавецтва «Наука». 1969 г.).

А. Яроменка ўжо вядомы чытачам як аўтар мемуараў аб Сталінградскай бітве і пачатковым перыядзе Вялікай Айчыннай вайны, калі ён камандаваў Заходнім, а потым Сталінградскім франтамі. Новая кніга прысвечана тым гадам вайны, калі ў ходзе баявых дзеянняў на савецка-германскім фронце наступіў перадом у карысць савецкіх войск. Яроменка ў гэты перыяд камандаваў войскамі Калінінскага, Прыбалтыйскага і 4-га Украінскага франтоў.

Паслядоўна апісваючы ход баявых аперацый, праведзеных войскамі, якімі камандаваў з лета 1943 года да поўнай перамогі над фашысцкай Германіяй, аўтар аналізуе іх асаблівасці, дае змястоўныя характарыстыкі многім генералам і афіцэрам, якія прымалі актыўны ўдзел у баях.

Мемуары напісаны жывой, вобразнай мовай, змяшчаюць многа тонкіх назіранняў. Аўтар аперыруе багатым фактычным матэрыялам аб падзеях на Заходнім стратэгічным кірунку, аб баях пры вызваленні Прыбалтыкі, Крыма, а таксама пры вызваленні Чэхаславакіі ад гітлераўскай акупацыі.

З вялікай цеплынёй аўтар расказвае аб сумесных дзеяннях Савецкай Арміі і часцей Чэхаславацкага корпуса, якімі камандаваў Людвік Свобада. Цяжка не пагадзіцца са сцвярджэннем А. Яроменкі, што вызваленне ў выніку сумесных намаганняў Мараўскай Астравы стала значным этапам на шляху да канчатковага разгрому фашысцкай Германіі.

Не будзе пераўвелічэннем сказаць, што мемуарная праца маршала А. Яроменкі паглыбляе і пашырае нашы звесткі аб багатым падзеямі заключным этапе Вялікай Айчыннай вайны,—у гэтым галоўная каштоўнасць кнігі «Гады адплаты».

Якаў ГАРЭЛІК, кандыдат ваенных навук.

КІЖСКАЯ ЛЕГЕНДА

«Кіжская легенда» — новы балет карэльскага кампазітара Гельмера Сінісала.

— У аснову яго пакладзены падзеі цэлай гістарычнай эпохі,— расказвае Гельмер Сінісала. — Гэта і будаўніцтва Пакроўскай царквы на востраве Кіжы, і барацьба карэльскага народа з іншаземцамі, і бунт сялян Заанежжа супраць царскага рэжыму. На фоне гэтых падзей чыстае, узвышанае каханне цесляра Нестара, які пабудаваў Пакроўскую царкву, і сялянскай дзяўчыны Алёнушкі. Ідэя твора: дружба карэльскага і рускага народаў.

Гельмер Сінісала — кампазітар з вялікім творчым багажом, чалавек, які востра адчувае і ведае жыццё і побыт карэльскага народа. Ён аўтар многіх сімфоній, камерных твораў, песень, музыкі да тэатральных спектакляў. Яго балет «Сампо», напісаны 10 гадоў назад і пастаўлены на сцэне Дзяржаўнага музычна-драматычнага тэатра Петразаводска, карыстаецца прызнаннем у гледачоў роднага горада. Гэты спектакль меў поспех і ў Маскве, Ленінградзе, Таліне, а таксама ў Фінляндыі. Паказалі яго і на Сусветным фестывалі моладзі ў Хельсінкі. Газеты, часопісы Фінляндыі пісалі пра балет як пра новы выдатны твор. «Сампо» — жывая культура», — пад такім загалоўкам змясціў фінскі часопіс «Аян куват» рэцэнзію на балет. «Прадстаўленнем для нас балета «Сампо» Карэльскі музычны тэатр даў прыклад аб выбары тэмы жывой культуры», — пісала крытык Элізабет Валто.

У дні дэкады Карэльскага мастацтва ў Маскве кампазітар Арам Хачатуран пісаў пра «Сампо» ў «Праўдзе»: «Музыка адзначана непаўторнасцю нацыянальнага каларыту высокім узроўнем кампазітарскай тэхнікі, многія яе старонкі па-сапраўднаму хвалююць. Навізна і арыгінальнасць бясспрэчна з'яўляюцца ў Сінісала там, дзе ён свабодна, творча звяртаецца да выкарыстання сапраўдных народных мелодый».

Хутка гледачы Петразаводска пазнаёмяцца з новым творам Гельмера Сінісала — балетам «Кіжская легенда».

Наргіс ЮОПЕРЫ, карэспандэнт АДН.

З МІНУЛАГА

ВІЛЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ І БЕЛАРУСЬ

ВІЛЕНСКІ універсітэт заснаваны ў другой палове XVI стагоддзя. Але на першым часе гэта была звычайная калегія ці гімназія, крыху пазней ператвораная ў акадэмію, а яшчэ пазней—у галоўную школу. Толькі ў 1803 годзе яна пачынае называцца Віленскім універсітэтам.

Дзякуючы універсітэту, Вільня зрабілася цэнтрам перадавой думкі прылягаючых літоўскіх, польскіх і беларускіх зямель. Тут было выхавана цэлае пакаленне носьбітаў рэвалюцыйнай ідэалогіі, якія змагаліся супроць царскага прыгнету за свабоду і дэмакратыю.

Ва універсітэце ўзнікла тайнае таварыства філаматаў і філарэтаў. Філаматы з павагай адносіліся да культуры беларускага народа, да яго гісторыі, вуснапаэтычнай творчасці. Не ставячы перад сабой непасрэдна рэвалюцыйных задач, студэнцкія таварыствы бачылі галоўную мэту ва ўздзеянні на грамадскую думку. Гэта асабліва зблізіла іх з арганізацыямі рускіх дваранскіх рэвалюцыянераў. Намеціліся кантакты паміж польскімі і беларускімі тайнымі арганізацыямі—у прыватнасці, паміж філаматамі і так званым «Свіслацкім навуковым таварыствам».

У складзе студэнцкіх таварыстваў было нямала беларусаў, якія вучыліся ў Віленскім універсітэце і Свіслацкай гімназіі. Сярод іх быў беларускі паэт і этнограф Ян Чачот, выкладчык гісторыі ў Віленскім пансіёне Томаш Зан, Адам Ходзька. Яны сябравалі з Адамам Міцкевічам, які ў той час таксама вучыўся ў Віленскім універсітэце, дапамагалі яму глыбей зразумець і ацаніць духоўнае багацце беларускага народа, палюбіць беларускія лясы, казкі, танцы, мелодыі, напевы. Усё гэта пазней знайшло адлюстраванне ў творчасці вялікага польскага паэта.

Вялікае ўздзеянне на філаматаў меў польскі гісторык, прафесар віленскага універсітэта Іосіф Лелевель, названы Марксам за шырыню сваіх рэвалюцыйных поглядаў «геніяльным чалавекам».

Многія ўдзельнікі тайных студэнцкіх арганізацый, разгромленых царскімі ўладамі, раз'ехаліся па гарадах Беларусі, дзе працягвалі сваю работу. Так, напрыклад, ужо ў 1829 годзе, праз пяць год пасля арышту ўдзельнікаў філамацкага руху, па патрабаванні гарадской паліцыі магілёўскі настаўнік В. Ігнатовіч мусіў заплаціць значны грашовы штраф за філамацкую дзейнасць.

Указам Мікалая II у 1832 годзе Віленскі універсітэт быў закрыты. Яго багаслоўскі факультэт быў ператвораны ў Рымска-каталіцкую акадэмію, а медыцынскі—у Медыка-хірургічную акадэмію. Праз год у медыцынскую акадэмію паступіў на вучобу будучы беларускі рэвалюцыянер, паплечнік Шымана Канарскага Франц Савіч.

Зерні прагрэсіўных, рэвалюцыйных ідэй, пасеяныя Віленскім універсітэтам, далі ўсходы ў самых розных кутках Беларусі. У пачатку 40-х гадоў мінулага стагоддзя апазіцыйнымі ў адносінах да царскага ўрада настроямі былі, напрыклад, ахоплены вучні Свіслацкай гімназіі, Маладзечанскага вучылішча. Вершы «злонаўмыснага» зместу былі знойдзены ў вучня 5 класа магілёўскай гімназіі Льва Пятроўскага. Савет гімназіі выключыў Пятроўскага з ліку навучэнцаў, як нядобранадзейнага па складу думак, здольнага «дрэнна» ўплываць на другіх вучняў.

У 1846 годзе за перапіску і распаўсюджанне вершаў, прасякнутых матывамі, накіраванымі супроць цара і царквы, былі арыштаваны, а затым сурова пакараны мінскія чыноўнікі Жывота і Лукашэвіч.

Многія вучоныя, выхаваныя ва ўмовах польскай культуры, але па нараджэнні ці паходжанні звязаныя з Беларуссю, і ў час дзейнасці Віленскага універсітэта і пасля яго закрыцця праяўляюць вялікую цікавасць да духоўнага жыцця працоўнага беларускага народа і яго культуры. Такімі былі С. Сястрэнцэвіч-Богуш, які нарадзіўся ў Валкавыскім павеце і займаўся пытаннямі славянскай мінуўшчыны, лінгвіст Міхась Баброўскі (паходзіць з Гродзеншчыны), вывучаючы славянскія мовы, ён аддае перавагу беларускай.

14 жніўня 1824 г. Баброўскі вымушаны быў пакінуць універсітэт, згодна пастанове «для разбора спраў беспарадка» ў Віленскім універсітэце.

Вялікую працу па гісторыі, геаграфіі і статыстыцы Беларусі напісаў выхаванец Віленскага універсітэта М. Балінскі, а таксама выхаванец, а затым прафесар гэтага ж універсітэта І. Ярашэвіч, пяру якога належыць даследаванне па этнаграфіі Гродзенскай губерні.

Нямала зрабіў для вывучэння Беларусі прафесар Віленскага універсітэта І. Даніловіч, які ў сваёй працы «Скарбніца дыпламатаў» змясціў каля тысячы артыкулаў па гісторыі права польскага і беларускага народаў. Гісторыя Беларусі разглядаецца і ў другіх даследаваннях І. Даніловіча — «Гістарычны погляд на літоўскае заканадаўства», «Аб летапісах літоўскіх», «Гістарычны позірк на ўтварэнне славянскіх гарадоў», «Кніга пасольскіх метрык княства Літоўскага» і г. д.

Выхаванец Віленскага універсітэта Аляксандр Здановіч нарадзіўся ў 1808 годзе, у сям'і беднага шляхціца Мінскай губерні. Выкладаў латынь і гісторыю ў шляхецкім інстытуце і духоўнай семінарыі. У сваіх навуковых даследаваннях па гісторыі Польшчы і Беларусі, аўтар адстайвае думку аб неабходнасці раўнапраўя ўсіх народаў, заклікае змагацца за развіццё іх культуры, нацыянальнага жыцця.

Дзейнасць Віленскага універсітэта — надзвычай цікавая, багатая падзеямі і фактамі старонка ў развіцці беларуска-літоўскіх культурных сувязей.

Я. НАВУМЕНКА.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

На пачатку сезона Гомельскі абласны рускі драматычны тэатр паказаў спектакль па п'есе югаслаўскага драматурга М. Мітравіча «Аграбленне апоўначы» ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра заслужанага артыста БССР І. Папова. Мастак — М. Гафт. На здымку вы бачыце сцэну са спектакля. У ролі Цыцы артыстка Т. Малодкіна, Д'ёлы — заслужаны артыст рэспублікі П. Філіпаў.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 лістапада.

Першая праграма. 17.15 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Свята цацак». Рэпартаж з Палаца піянераў. 17.40 — «Панарама навін». 17.55 — «ГДР—краіна кніг». Дакументальны фільм. 18.15 — «Чалавек зямлі маёй». Тэленарыс пра агранома калгаса «Зорка» Навагрудскага раёна, Героя Сацыялістычнай Працы, дэлегата III Усесаюзнага з'езда калгаснікаў М. М. Карповіч. 18.30 —«Ленінскі універсітэт мільёнаў», «Вялікі Кастрычнік—пачатак новай эпохі сусветнай гісторыі» (М). 19.00 — «Узнятая цаліна». Мастацкі фільм. 1-я серыя (М). 20.30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — праграма, прысвечаная III Усесаюзнаму з'езду калгаснікаў (М). 22.30 — навіны (М). 22.45 — для студэнтаў вну. «Начартальная геаметрыя». 23.15 — для студэнтаў вну. «Тэхналогія металаў».

Другая праграма. 17.15 — «Народныя майстры прыкладнога мастацтва» (М). 18.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Музычны церамок». Перадача з Пярмі. 20.45 — экран—завочнікам. Гісторыя філасофіі. «Філасофія, яе прадмет і роля ў грамадстве». 21.15 — экран—завочнікам. Гісторыя філасофіі. «Узнікненне марксісцкай філасофіі і асноўныя этапы яе развіцця».

26 лістапада

Першая праграма. 10.45— М. Пагодзін. «Янтарныя каралі». Тэлевізійны спектакль. 1-я частка (М). 12.00 — «Акадэмія земляробаў». Аб рабоце Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя У. І. Леніна (М). 12.30 — «І на спартыўнай ніве славяцца калгасы». Рэпартаж (М). Уключэнне Мінска. 15.10 —праграма перадач. 15.15 — школьная фільматэка. «Дон Кіхот». Мастацкі фільм. 17.00 — навіны (М). 17.15 — канцэрт Маскоўскага камернага ансамбля «Барока». У праграме — старадаўняя музыка. 17.55 —«Панарама навін». 18.15 — «Дні жыцця Андрэя Савенкі». Прэм'ера тэлевізійнага дакументальнага фільма (М). 18.45 — праграма каляровага тэлебачання. «Спяваюць палтаўскія дзяўчаты». Канцэрт. Перадача з Кіева. 19.30 — «Сёння—рубеж перадавікоў, заўтра—здабытак кожнага». Хлебаробы Гродзеншчыны абменьваюцца вопытам. 19.50—«Беларуская савецкая энцыклапедыя». Да выхаду ў свет першага тома. 20.30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.00 —спартыўная перадача (М). 22.45— «Лінія, якая ідзе ў бесканечнасць». Аб развіцці сучаснай харэаграфіі. 23.35—навіны (М).

Другая праграма. 17.15 — у эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда. 19.30 — «Масква —Варшава». Тэлевізійная пераклічка (М). 22.45 — праграма каляровага тэлебачання (М).

27 лістапада.

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — навіны (М). 17.15 — для дзяцей. «Нашы памочнікі» (М). 17.45 — «Карычневы туман над Рэйнам». Пра барацьбу працоўных Заходняй Германіі супраць мілітарызму і неанацызму.

Тэлевізійны фестываль абласцей Беларусі. «У эфіры— ардэнаносная Магілёўшчына». 18.00 — «Нашы справы, нашы задачы». Інтэрв'ю з сакратаром Магілёўскага абкома КПБ Л. М. Барабанавай. 18.15 — «Галоўная вуліца». Кінанарыс. 18.30 — «Ленінскі універсітэт мільёнаў». Школа палітычнай самаадукацыі. «Работа над першакрыніцай» (М). 19.00 — «Узнятая цаліна». Мастацкі фільм. 2-я серыя (М). 20.35 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — «Панарама навін». 21.40 — «Знак якасці». Тэленарыс. 21.55 — «Важкі колас». Перадача прысвечана калгасу «XXI з'езд КПСС» Мсціслаўскага раёна. 22.25 — «Масква, Крэмль, таварышу Леніну». Расказ пра лёс сяла Леніна Гарацкага раёна. 22.40 — на ўдарных будоўлях пяцігодкі. «Крокі Лаўсанбуда». Рэпартаж. 23.10 — «Вяснянка». Канцэрт-нарыс. 24.00 —навіны (М).

Другая праграма. 17.45 — літаратурны тэатр «Сельскія апавяданні» (М). 20.45 — экран—завочнікам. Гісторыя КПСС. «Барацьба партыі за датэрміновае выкананне плана другой пяцігодкі. Перамога сацыялізма ў СССР». 21.15 — «Музычны калейдаскоп» (М). 22.00 —«Цвёрды сплаў». Тэлевізійны нарыс (М). 22.30 — «Майстры экрана». Народны артыст РСФСР К. Лаўроў (М).

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856 Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 19063

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023